УМОВЫ ПАДПІСКІ:
На 1 м-ц—90 к.; на 3 м-цы—2 р. 60 к. на 6 м-цаў—5 р.; на 1 год—9 р. 75 к.
Змена адрасу: мясцовага—10 к., іншагароднага—20 кап.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:
За радок пошпальгі (пасьля тэксту)—50 кап. Для Масквы і Ленінграда—1 р.
Пасьлядоў тэксту у [illegible]
Пры шматразовым [illegible]
Згодна паст. С[illegible]
бярэцца зьверх

Падпіска і абвесткі прымаюцца: У Гал. Канторы газ. [illegible] 63, трэці паверх, ад 9 гадз. раніцы да 3-х гадз. дня. Бел. Дзярж. Выдавецтва і на усіх пошт.-тэл. канторах,
РЭДАКЦЫЯ—Г. МЕНСК, САВЕЦКАЯ, 63.

ЗЬВЯЗДА

Орган [illegible] ітэту камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Мен. АК КП(б)Б.

РЭДАКЦЫЯ і ГАЛОЎН. КАНТОРА.
1) Рэдактар прымае ад 11—1 гадз. дня: тэлефон № 10-74. 2) Сакратар рэдакцыі—ад 12 да 2-ое гадзіны дня, тэл. № 6-19. 3) Начны рэдактар (друкарня) ад 6 гадз. веч. тэл. № 6-42
Кіраўн. Гал. Канторай } тэл. № 731.
Кантора абвестак і падпіскі }

ПЯТНІЦА, 20 СТУДЗЕНЯ 1928 г.
№ 17 (2824)
Кошт асобнага нумару ўсходы 5 кап.
Год выданьня дванаццаты.

Государств. Публичной Биб[illegible]

ВЫСЫЛКА ТРАЦКІСТЫХ

Учарашняе паведамленьне ТАСС'а аб высылцы з Масквы раду актыўных трацкістых ні для каго не зьявілася неспадзяванкаю.

Апублікаваная на днёх у «Правде» перапіска маскоўскага трацкісцкага цэнтру з яго замежнымі «прадстаўнікамі» была проста абураючая па сваім зьмесьце.

Контр-рэвалюцыйныя намеры трацкісцкай групы былі выяўлены ў ёй з поўнаю відавочнасьцю.

Тады-ж паўстала само сабою пытаньне: так гэта пакінуць нельга, неабходны якіясьці меры, далей цярпець і выгадоўваць ва ўмовах савецкае дэмакратыі ворагаў партыі і Камінтэрну недапушчальна.

Перапіска пядвусэнсоўна сказала рабочым нашай краіны і ўсяму міжнароднаму пралетарыяту, што група Троцкага стаіць за «больш круты націск» (чытай—вайну) міжнароднага капіталу па СССР, што ў гэтым «націску» трацкістыя бачаць досыць верны сродак «стварыць у партыі рашучы зрух улева» (?).

Перапіска даказала, што група Троцкага ідзе ў блёку з усімі рэпэгатамі камунізму, з усімі асобамі і групамі, выключанымі ў розныя часы з Камінтэрну, што трацкістыя робяць спробы аб'яднаць гэтыя элементы і супроцьставіць іх Камінтэрну.

Перапіска паказала далей, што, ня гледзячы на свае абяцаньні XV зьезду «аб падпарадкаваньні пастановам XV зьезду і аб роспуску нашай фракцыі», трацкістыя ня спыняюць весьці ўзмоцненую нелегальную работу супроць УсеКП(б) і Камінтэрну.

«Траба біць па кіраўніцтву УсеКП(б)»—вось лейт-матыў апублікаванай перапіскі.

Характэрна адзначыць таксама адносіны групы Троцкага да адкалоўшыхся ад апазыцыйнага блёку Зіноўева, Каменева і інш., якія бясспрэчна падпарадкаваліся пастановам партыі і ідуць цяпер на нізавую савецкую работу.

«Здрада», «капітулянты»—вось як трацкістыя называюць сваіх учарайшых саюзьнікаў, якія адважыліся падпарадкавацца партыі.

Ці магчыма пасьля ўсяго гэтага было дазволіць трацкістым працягваць далей бяскарна тварыць іх здрадніцкую справу?

Мы былі-б не рэвалюцыянэрамі і не марксыстымі, а драблымі дробна-буржуазнымі палітыкамі, калі-б пакінулі гэтыя злачынствы без пакараньня.

На плячох нашай партыі ляжыць вялізарная адказнасьць за лёс рэвалюцыі ў нашай краіне і за справу сацыялізму ва ўсім сьвеце.

Група Троцкага выявіла сваю контр-рэвалюцыйную сутнасьць з наяўнасьцю, якая не дапускае сумневьняў 1 вельга было-б дараваць, калі-б мы, кіруючыся пабочнымі мотывамі («заслугі перад рэвалюцыяй» і інш.), праявілі недапушчальную ў даным выпадку мяккацеласьць.

З ворагамі партыі і рэвалюцыі трэба абыходзіцца па-ленінску, бязьлітасна.

ХТО ТАРМОЗІЦЬ ЗАГАТОЎКІ

НІЗОЎКА—БЯЗ ГРОШАЙ.

ЗАГАТОЎЛЕНА 6.000 ПУД. ХЛЕБА

(Ад нашых карэспандэнтаў)

У раёнах за апошнія 4—5 дзён пазіраецца ўзмацненьне загатовак хлеба і сырцу. За апошнія дні ў Узьдзе загатоўлена 2.000 пудоў збожжавых прадуктаў, у Плешчаніцах—1.500 пудоў, у Мсьціжы—1.000 пудоў, у Барысаве—1.500 пуд.

Таксама павялічылася здача сырцу. Барысаўскае аддзяленьне скурсындыкату, пачынаючы з 1-га студзеня, загатовіла скурсырцу на 2.600 руб. у той час, як за ўвесь першы квартал яно загатовіла сырцу толькі на 3.000 р.

Ня гледзячы на значны напчыў хлеба, нізоўка ня мае ў сваім распараджэньні патрэбных сродкаў для загатоўкі. Віна за гэта падае на каапэрацыйныя цэнтры.

Некаторыя сельска-гаспадарчыя і спажывецкія т-вы да гэтага часу яшчэ не атрымалі ад сваіх цэнтраў загатоўчых цэн па сырцу.

Узьдзенскі пункт Белдзяржгандлю зусім не загатаўляе другарадных відаў экспартнага сырцу.

Вылучаныя прамтавары для рэалізацыі праз с.-г. каапэрацыю (сячкарні, швейныя машыны і інш). прасоўваюцца на вёску вельмі марудна.

МАГЧЫМАСЬЦЬ КРЫЗІСУ ЯПОНСКАГА ГАБІНЭТУ

ТОКІЁ, 18. Былы лідэр партыі Сэйюкай Акасакі ў гутарцы з прадстаўнікамі друку заявіў, што, на яго думцы, апазыцыйная партыя Мінсэйто ня зможа сабраць у парляманце патрабнае колькасьці галасоў для правядзеньня розалюцыі недавер'я ўраду Танака. З другога боку, партыя Сэйюкай, па словах Акасакі, ня мае намеру праяўляць ініцыятыву ў пытаньні аб роспуску парляманту. „Прычына такой зьмены плянаў у партыі Сэйюкай,—піша газэта.—заключаецца ў выявіўшайся слабасьці апазыцыйнай партыі Мінсэйто. Лідэры Сэйюкай пераконаны, што ім удасна перацягнуць на свой бок 17 дэпутатаў партыі Мінсэйто і, акрамя таго, падгаварыць яшчэ 10 апазыцыйных дэпутатаў не зьявіцца ў палату ў часе галасаваньня вотуму недавер'я ўраду. Партыя Сэйюкай плаціць кожнаму члену партыі Мінсэйто па 10.000 іен за пераход у рады Сэйюкай. За адсутнасьць у часе галасаваньня вотуму недавер'я ўраду Танака партыя Сэйюкай плаціць апазыцыйным дэпутатам па 500 іен кожнаму. Такім чынам Сэйюкай зможа адняць у апазыцыі 5.000 галасоў".

* * *

Сучасная сэсія японскага парляманту адчынілася 26 сьнежня. Урадавая большасьць у японскім парляманце вельмі нязначная. Так, партыя Сэйюкай мае ў парляманце 189 галасоў, у той час, як апазыцыйная партыя Мінсэйто мае 222 галасы. Іншыя партыі маюць у парляманце незначную колькасьць галасоў, якія, аднак, пакуль што, стваралі магчымасьць ураду мець у парляманце большасьць і тым ухіляцца ад адстаўкі габінэту. Усё-ж, з прычыны нязначнае большасьці галасоў урадавых партый, становішча ўраду хісткае і ў кожны момант можа выпікнуць крызіс габінэту.

ДЭТЭРДЫНГ ПАГРАЖАЕ ВАЙНОЮ

калі будзе купляцца савецкая нафта

НЬЮ-ЁРК, 18. Рычард Эйры—прадстаўнік Дэтэрдынга ў Нью-Ёрку, зрабіў прадстаўніком друку наступную заяву:

«Роял Дэч» будзе весьці барацьбу супроць «Стандарт Ойль» ва ўсіх краінах, дзе «Сандарт Ойль» зробіць спробу прадаваць савецкую нафту. Нафтавая вайна ня будзе спынена да таго часу, пакуль Стандарт Ойль» ня спыніць продаж савецкай нафты, ці Савецкі Саюз не кампэнсуе былых уласьнікаў нафтаносных зямель у Расіі. У сучасны момант таварыства «Стандарт Ойль» прадае ў Кітаі толькі амэрыканскую нафту. Але калі яно пачне прадаваць там і савецкую нафту, то «Роял Дэч» узьніме супроць яго вайну і на кітайскім рынку.

Наконт перагавораў Дэтэрдынга з савецкім урадам Эйры заявіў наступнае: «Перагаворы мелі на ўвазе дзве меты: папершае, дабіцца кампэнсацыі для былых уласьнікаў расійскіх нафтаносных зямель, канфіскаваных савецкім урадам, і падругое, вырашыць праблемы дэмаралізацыі рынку. Калі-б перагаворы закончыліся пасьпяхова, то нафта была-бы падзелена паміж «Роял Дэч» і іншымі нафтавымі кампаніямі і, такім чынам, была-б забясьпечана ўстойлівасьць рынку. Перагаворы аб кампэнсацыі былых уласьнікаў мелі сур'ёзны характар, але чыннасьць «Стандарт Ойль» перашкодзіла посьпеху перагавораў. Закупкай савецкай нафты «Стандарт Ойль» зрабіў натрыманьне саветам і апошнія ня мелі больш пякіх падстаў трывожыцца аб інтарэсах былых уласьнікаў нафтаносных зямель. Паколькі «Стандарт Ойль» прадаваў у Індыі амэрыканскую нафту, усё ішло сваім звычайным парадкам, але з моманту ўвозу ў Індыю савецкай нафты, замест амэрыканскай, «Рояль Дэч» пачаў барацьбу і будзе працягваць яе. Я не прадрашаю пытаньня аб барацьбе за цэны ў другой краіне, акрамя Індыі; гэта ўсяцэла належыць ад «Стандарт Ойль». Калі «Стандарт Ойль» пачне прывозіць савецкую нафту ў якую-небудзь іншую краіну, акрамя Індыі, дык «Рояль Дэч» будзе змагацца з гэтым».

На панамэрыканскай канфэрэнцыі

(Ліга Нацый № 2)

Кулідж рэкамандуе канфэрэнцыі абмежаваецца абгаворваньнем пытаньняў, якія „замацоўваюць пачуцьці адзінства“ (З газэт)

Узмацненьне пачуцьця адзінства

БЭЙЛІН

Да Усебеларускага зьезду яўрэяў-сялян

20-га студзеня адчыняецца Усебеларускі зьезд яўрэяў-сялян. Камуністычная партыя і савецкая ўлада Беларусі надаюць гэтаму зьезду вялізнае значэньне, ускладаючы на яго рад важнейшых задач. Мы хочаці-б закрануць тут асобныя практычныя пытаньні, якія зьезд павінен будзе паставіць і вырашыць.

Адной з важнейшых задач, што стаіць перад партыяй па рабоце ў вёсцы, выяўляецца вызначэньне і правядзеньне практычных мерапрыемстваў, якія павінны паступова перавесьці асобныя распыленыя сялянскія гаспадаркі на сацыялістычныя рэйкі; укараніць іх у агульную сацыялістычную гаспадарку, аўладаць сялянскай стыхіяй праз каапэрацыю, замацаваць і пашырыць сацыялістычныя формы ў сельскай гаспадарцы—калектывы,—вось асноўная лінія партыі па рабоце ў вёсцы, вось дырэктывы XV партызезду.

Савецкая ўлада за апошні год эжыцьцявіла рад мерапрыемстваў па ўзмацненьні і палепшаньні становішча калектыўных гаспадарак. Досыць зазначыць на дэкрэт ад 16 сакавіка 1927 году. Згодна гэтаму дэкрэту, у распараджэньне калгасаў былі перададзены будынкі і іншая маемасьць, належачыя раней дзяржаве (дзяржэвмаемасьць), значна палегчаны кредыты для калгасаў, зьменшаны падаткі. У распараджэньне калгасаў перададзены таксама дапаможныя прадпрыемствы, якія знаходзіліся ў раколіцах, і г.д. Гэты дэкрэт зьяўляецца лепшым доказам таго, паколькі савецкая ўлада ідзе насустрач, дапамагае і падтрымлівае калектыўную сельскую гаспадарку.

Яўрэйскія калектыўныя гаспадаркі, зразумела, не складаюць выключэньня. Дзякуючы мерапрыемствам партыі і савецкае ўлады (кредыты, зьмяншэньне падаткаў, уважлівы адносіны з боку партыйных і савецкіх органаў), яны значна насунуліся наперад, вырасьлі і ўзмацніліся. Як агульнае зьявішча, можа быць адзначана палепшаньне гаспадарчага становішча яўрэйскіх калгасаў.

170 яўрэйскіх калгасаў на тэрыторыі Беларусі, узьняўшых сваю гаспадарку на высокую ступень, гаворыць за тое, што калектыўная форма землякарыстаньня поўнасьцю сябе апраўдала і што далейшая работа па выдзяленьні буйных масываў для яўрэйскага землянадзяленьня павінна будзе таксама ісьці па шляху калектывізацыі.

Калгасы на першым плянe—такі агульны лёзунг партыі. Такі і наш лёзунг ў адносінах да яўрэйскае сельскае гаспадаркі.

Пад знакам калектывізацыі павінна будзе працякаць і работа зьезду яўрэяў-сялян. Зьезду неабходна будзе выявіць і намеціць далейшыя мерапрыемствы, якія далі-б магчымасьць яшчэ больш укараніць калектывізм у сельскай гаспадарцы.

Практычна ўвага зьезду павінна быць завострана на наступных пытаньнях.

Поўнае дакамплектаваньне арцеляй. Побач са значнымі дасягненнямі, якія мы маем у калектывах за апошні час, неабходна адзначыць і адзін адмоўны бок у іх рабоце. Гэта—няпоўнае іх укамплектаваньне, якое часта перашкаджае ўзьняцьцю іх гаспадаркі на больш высокую ступень. Нам здаецца, што як і пытаньні гаспадаркі, так і здавальненьне культурных патрэб—школы, дзіцячыя сады, пляцоўкі і г. д.—усё гэта можа быць канчаткова вырашана толькі ў тым выпадку, калі склад арцеляй будзе поўнасьцю ўкамплектаваны.

Асаблівае значэньне таму набывае пытаньне аб уступным паі. Нагул, з гаспадарчага боку нашы калектывы растуць. З іх балянсаў відаць, што адбываецца працэс накапленьня, а з гэтай прычыны і паступовы рост паю. Уваход новых членаў, новай сям'і ў такі калектыў зьвязан з унясеньнем значнага паю. Калектыў, такім чынам, закрываецца, робіцца недаступным для працоўных, якія ня маюць адпаведнае сумы. Гэта акалічнасьць павінна быць урэгулявана.

Для ўзмацненьня калектывізму ў арцелях неабходна, асабліва ў першыя гады, максымальную ўвагу зьвярнуць на накапленьне з тым, каб значная частка прыбытку ішла на ўзмацненьне гаспадаркі, праводзячы тут суровы рэжым эканоміі. Толькі пасьля таго, калі пад гаспадарку будзе падведзена моцная гаспадарчая база, далейшае накапленьне можа пайсьці і на пашырэньне спажываньняў членаў каапэратыву. Асабліва важнай павінна быць задача па выдзяленьні сродкаў **у недзялімы капітал.** Фактычна гэта будзе адзначаць, што кожны член калектыву больш звязаецца і зьвязваецца з гаспадаркаю. Нажаль, ня ўсюды праводзяцца адлічэньні нават у норме, прадугледжанай статутам (20 проц., што затрымлівае гаспадарчы рост калектыўнае вытворчасьці.

Форма падзяленьня працы і ўдзелу ў прыбытках таксама павінна быць урэгулявана. У гэтых адносінах наглядаецца нераўзьцярыха: кожная арцель мае свой падход. У адным месцы прыбытак падзяляецца паміж сем'яў, што часткова прыводзіць да таго, што ня ўсе працаздольныя ўцягваюцца ў работу, а кожная сям'я высоўвае роўную колькасьць рабочае сілы. У другім месцы прыбытак падзяляецца адпаведна ліку сдакоў, прычым устанаўліваюцца розныя катэгорыі процантаў (для дзяцей і для жонак). У другіх мясцох ён падзяляецца адпаведна колькасьці працаздольных членаў сям'і.

Зьезду прыдасца абмеркаваць усе гэтыя пытаньні, каб унесьці пэўную аднастайнасьць у гэтых адносінах, выказаць сваю думку па пытаньні аб падзяленьні працы і аб удзеле ў прыбытках і якая форма зьяўляецца больш правільнай і мэтазгоднай.

Усебеларускі зьезд яўрэяў-сялян

АДКРЫВАЕЦЦА СЁНЬНЯ,

20-га студзеня 1928 г., а 6 гадзіне ўвечары, у Дзяржаўным тэатры.
А 5 гадзіне склікаецца камуністычная фракцыя зьезду.
Фракцыя адбудзецца ў малой залі клюбу Карла Маркса (насупраць Дзяржтэатру).

Ангельскі ўрад турбуецца аб „безапасьнасьці“

ЛЁНДАН, 18. Агэнцтва «Рэйтэр» паведамляе:

„Ангельскі ўрад агалосіў мэмарандум наконт праграмы працы камісіі безапасьнасьці. Мэмарандум зазначае, што ў міжнародных канфліктах трэба разьмяжоўваць канфлікты прававога характару в повазу якіх-небудзь законных праў і неправаных канфлікты палітычнага характару".

Далей пазначэльваецца, што арбітражныя ўгаворы не падмацоўваюцца ніякімі санкцыямі, апроч сусьветнае грамадзкае думкі. Таму незадаволеныя дзяржавы могуць іх проста ня выконваць, тым больш, што наўрад ці якая-небудзь іншая дзяржава згадзілася-б ужываць прымусовыя меры супроць тых ці іншых удзельнікаў канфлікту, якія адмовіліся прызнаць арбітражную пастанову. Да таго-ж звычайна робіцца агаворкі адносна дастасаваньня арбітражу. Калі нацыі больш будуць разумець адна адну, тады арбітраж будзе больш шырока практыкавацца.

Далей у мэмарандуме гаворыцца, што лягчэй дасягнуць гарантыйнай безапасьнасьці, калі рад зацікаўленых у якім-небудзь пытаньні дзяржаў будуць зьвязаны між сабою сыстэмаю дагавораў, як да прыкладу—лёкарнскі дагавор. У канцы мэмарандум выказваецца супроць літаральнага тлумачэньня артыкулаў статуту Лігі Нацый, зазначаючы, што сіла статуту—у яго гібкасьці. Надобна-ж пункту погляду трымаецца ангельскі ўрад у пытаньні вызначэньня нападаючага боку".

* * *

Досыць шырокі мэмарандум ангельскага ўраду ў пытаньні аб безапасьнасьці, як бачым, напоўнены адымі лісьлівымі словамі і зусім пазбаўлен канкрэтных прапаноў, якія маглі-б сапраўды парушыць упэрад справу безапасьнасьці, справу міру. Натуральна, што апроч слоў і плятаўічных пажаданьняў мэмарандум ангельскага ўраду і ня мог нічога вымяхчаць, бо Англія ўвесь час упарта рыхтуецца да вайны. Варта ўспомніць антысавецкія інтрыгі Англіі ў радзе суседніх з СССР краін, паездку вайсковага міністра ў Індыю і іншых фактаў, як англа-амэрыканскае супэрніцтва ў справе марскога ўзброеньня, каб стала ясна, што гэты мэмарандум зьяўляецца сродкам адцягнуць сусьветную грамадзкую думку ад ваеннае падрыхтоўкі Англіі. Гэтым тлумачыцца ўся пазыцыя Англіі ў пытаньні аб разброеньні і безапасьнасьці.

Рост цікавасьці да гандлю з СССР

БЭРЛІН, 18. Вашынгтонскі карэспандэнт «Берлінэр Тагэблят» паведамляе, што заява «Стандарт Ойль» наконт дзеяньняў Дэтэрдынга значна ажывіла зацікаўленасьць дзелавых колаў ПАЗШ да гандлёвых зносін з СССР. Боязьнь «сувязі з бальшавікамі», па словах карэспандэнта, усё больш адступае ў ПАЗШ на задні плян перад ідэяй амэрыканскага спаборніцтва з Англіяй.

Нота Малой Антанты аб правозе зброі

ПАРЫЖ, 18. Газэта „Пты Парыз'ен“ публікуе паведамленьне афіцыйнага характару, у якім гаворыцца, што некалькі дзён таму назад делегат Чэха-Славакіі перадаў Лізе Нацый ноту Малой Антанты, уложаную Бэнэшам па пытаньні аб пагаемным правозе зброі ў Вэнгрыю.

Адзначаючы, што Ліга Нацый павінна ажыцьцёвіць на практыцы свае правы рассьледваньня, „Пты Парыз'ен“ піша:

„Мы спадзяёмся, што ангельскае вэнграфільства ня будзе прычынаю да таго, каб члены рады Лігі Нацый адмовіліся од прыняцьця неабходных да забясьпячэньня міру мер“.

Барацьба кітайскіх генэралаў

ТОКІЁ, 18. Японскае міністэрства замежных спраў атрымала ад японскіх консульскіх улад у Шасі (на поўдні правінцыі Хубэй) тэлеграму, якая паведамляе, што займаючыя Шасі войскі Ян Сэна маюць намер пакінуць горад і патрабавалі ад мясцовай гандлёвай палаты ўплаты ім кантрыбуцыі ў разьмеры 40.000 даляраў, а таксама выплаты выдаткаў на эвакуацыі. Войскі Ян Сэна, апроч таго, увозяць з сабою адну з урадавых асоб Шасі, за вызваленьне якое патрабуюць выкуп. Як паведамляе карэспандэнт газэты „Токіё Асахі“, у Шасі [illegible] і [illegible] пасьля 8 гадзін вечара забаронены».

ПЕКІН, 18. Як даносіць ханькоўскі карэспандэнт японскага агэнцтва, камуністыя распаўсюджваюць у Ханькоў плякаты і лістоўкі з патрабаваньнем стварэньня рабоча-сялянскага ўраду. 16-га студзеня ў Ханькоў абвешчана ваеннае становішча.

Ханькоў на ваенным становішчы

ТОКІЁ, 18. Па зьвестках агэнцтва «Ніпон-Дэмпо» ў Ханькоў панус трывожны настрой. «Камуністыя,—гаворыцца ў паведамленьні агэнцтва,—разьвіваюць у Ханькоў агітацыю за забойства ўсіх капіталістых і чыноўнікаў. У горадзе абвешчана ваеннае становішча. Усяк[illegible] на вуліцах пасьля 8 гадзін вечара забаронены».

ПЕКІН, 18. Як даносіць ханькоўскі карэспандэнт японскага агэнцтва, камуністыя распаўсюджваюць у Ханькоў плякаты і лістоўкі з патрабаваньнем стварэньня рабоча-сялянскага ўраду. 16-га студзеня ў Ханькоў абвешчана ваеннае становішча.

Новыя арышты ў Шанхаі

ШАНХАЙ, 18. У Путуне (прыгарад Шанхаю) арыштавана 7 кітайскіх камсамольцаў. Як паведамляюць газэты, пры арышце знойдзены рэвалюцыйныя лістоўкі і літаратура.

Посьпехі Фын Юй-сяна

ШАНХАЙ, 18. Штаб войск Фын Юй-сяна паведамляе, што перадавыя атрады Фын Юй-сяна занялі Пуян і Чынфун, якія знаходзяцца ў 50 кіляметрах на поўдзень ад Тамінфу (на поўдні правінцыі Чжылі).

ШАНХАЙ, 18. Паведамляюць, што паўднёвыя войскі абыходзяць Цзынаньфу з паўночнага ўсходу і з паўночнага захаду, [illegible] занялі Цзупін (у 70 клм. на паўночны ўсход ад Цзынаньфу) і Іенчэн (у 30 клм. на паўночны захад ад Цзынаньфу) чыгунка на вучастку паміж Цзынаньфу і Іочэнам разбурана.

Пратэст супроць продажу зброі Чжан Цзо-піну

ШАНХАЙ, 18. Камісар па замежных справах правінцыі Цьзансу заявіў італьянскаму консулу пратэст супроць продажу Італіяй Чжан Цзо-піну 40.000 стрэльб.

Абмен нотамі між Залескім і Вальдэмарасам

Польшча ня выканала сваіх абяцаньняў

КОЎНА, 18. Газэты агалашаюць кароткі зьмест ліста польскага міністра замежных спраў Залескага да літоўскага прэм'ера Вальдэмараса і адказ Вальдэмараса на гэты ліст. Залескі ў сваім лісьце прапануе пачаць 31 студзеня ў Рызе перагаворы аб пагранічных, паштовых, тэлеграфных і чыгуначных зносінах, а таксама аб транзіце.

У сваім адказе Вальдэмарас адзначае, што Польшча дагэтуль ня выканала даных ёю ў Жэнэве абяцаньняў, а ўласна літоўцы, высланы ў Вільні, дагэтуль не атрымалі магчымасьці вярнуцца ў Вільню; арганізацыя эміграцыкае арміі, з Плячкайцісам начале, дагэтуль не ліквідавана, пры чым гэта армія, абмундзіраваная палякамі ў літоўскую вайсковую форму, дагэтуль утрымліваецца ў польскіх вайсковых казармах у Ліцве.

Далей Вальдэмарас заяўляе, што ў польскіх прапановах адзначаюць якія-небудзь канкрэтныя праекты, без якіх літоўскі ўрад лічыць немагчымым посьпех перагавораў. Што-ж датычыць пытаньняў, якія падлягаюць абгавору, дык літоўскі ўрад прапануе дазучыць да іх пытаньне аб адшкадаваньні за страты, прычыненыя ваеннаю чыннасьцю Жалігоўскага (які захапіў Вільню ў 1920 г.). Нарэшце, у пытаньні аб месцы перагавораў, Вальдэмарас заяўляе, што вырашэньне гэтага пытаньня будзе залежаць ад таго, ці будуць перагаворы адбывацца пры ўдзеле Лігі Нацый, ці непасрэдна.

Весткі адусюль

— Французкім судом засуджаны за агітацыю антымілітарысцкіх артыкулаў рэдактар „Юманіта“ Гэй (на 6 мес.) і два іншыя рэдактары камуністычных газэт на 1 год турмы і да грашовага штрафу.

— Выкуўлена 4 нападчыкі на савецкую выстаўку ў Брусэлі. Усе яны будуць прыцягнуты да суду.

— „Сіняй блузе“ забаронен прыезд на гастролі ў Эстонію.

— Вярхоўны кантроль над выбарамі ў Нікарагуа даручан не камандзіру войск П.-А. З. Ш. у Нікарагуа, як таго дамагаліся Злучаныя Штаты, а нікарагуанскаму кангрэсу.

— *Камісія Лігі Нацый па пытаньні аб уцекачох мае намер адправіць у краіны Поўднёвае Амэрыкі расійскіх белых эмігрантаў, высланых з Турцыі.*

— *Амэрыканскія капіталісты ў 1927 годзе ўклалі ў замежныя пазыкі 1.574.960 тыс. даляраў, г. з. на 166.305 тыс. даляраў больш, чым у 1926 годзе.*

З усіх куткоў СССР

—18-га студзеня ў Маскве адчыніўся ўсесаюзны зьезд інжынэраў і тэхнікаў мэталяпрамысловасьці.

—На бакінскіх нафтапрамыслах забіў новы фантан, які дае 400 тон нафты ў суткі.

—За буйныя дасягненьні ў справе радыёвяшчаньня Усерасійскі ЦВК другі раз узнагародзіў Нижэгарадскую радыёвую лябараторыю ордэнам Працоўнага Чырвонага Сьцягу.

—Цюменскае акрэдытнае т-ва выканала плян хлебазагатовак з перавышэньнем на 140.000 п.

ПОЛЬШЧА ПЕРАД ВЫБАРАМІ

Новыя ільготы асаднікам

ВАРШАВА, 18. Распрацаван праект распараджэньня аб аслабаненьні ад уплаты дзяржаўных і самаўрадавых збораў за атрыманыя землі пры парцэляцыі маёнткаў. Як ведама, зямля, распрадаваная ў Беларусі і Украіне пад Польшчаю маёнткаў аддаецца асаднікам а не мясцоваму жыхарству. Такім чынам, новае распараджэньне пакіравана палком на карысьць асаднікаў на „крэсах“.

Яшчэ асадніцтва

ВАРШАВА, 18. „Глос Праўды“ паведамляе, што зьезд старшынь земскіх самаўрадаў, які адчыніўся 17 студзеня, абмяркуе пытаньне аб надзяленьні зямлёю высланых з Чэха-Славакіі і Нямеччыны асоб, якія былі „адданымі прадаўнікамі“, на карысьць Польшчы (рэшуцкі—польскіні шпіёнамі).

Зьезды дробнае буржуазіі.

ВАРШАВА, 18. У зьвязку з кампаніяй выбараў у сойм і сэнат гэтымі днямі адбудзецца шэраг вайсковых зьездаў дробнае буржуазіі.

Выключэньне з унівэрсытэту за нацыянальнае ўбраньне

ВАРШАВА, 18. У львоўскіх украінскіх колах вельмі абураны выключэньнем з Львоўскага унівэрсытэту студэнта за тое, што ён зьявіўся ва унівэрсытэт у нацыянальным убраньні. Па гэтай глебе і раней адбываліся крывавыя сутычкі між польскаю і ўкраінскаю моладзьдзю.

За няўплату падаткаў... пазбаўленьне голасу

ВІЛЬНЯ, 18. Сьвяцянскі выбарчы камітэт пастанавіў пазбавіць голасу ўсіх не заплаціўшых падаткаў. Зразумела, што бедната ня можа плаціць непамерныя падаткі, якія да таго-ж вельмі сурова спаганяюцца. У радзе перадвыбарных і выбарных мацінацый і гвалтаў і гэта мера можа разьвіравана на тое, каб пазбавіць апазыцыйныя пар[illegible] [illegible] класоў

Яўрэйскія купцы—з блёкам меншасьцяй

ВАРШАВА, 18. „Глос Праўды“ паведамляе, што зьезд яўрэйскіх купцоў Заходняе Беларусі, які адбыўся ўчора ў Вільні, пастанавіў, наўпроці дамаганьняў яўрэйскіх купцоў з Польшчы, дазучыцца да блёку меншасьцяй, тлумачачы гэты крок розьнымі інтарэсамі яўрэйскіх купцоў в Польшчы і в Заходняе Беларусі.

Блёк ППС з Бундам

БЕЛАСТОК, 18. Мясцовыя арганізацыі ППС і Бунду пастанавілі выступіць з супольным сьпісам на выбарах у сойм і сэнат. Першым кандыдатам высоўвасцца Барэйкі (ППС), другім—Эрліс (Бунд).

Выбарчы сьпіс манархістых

ВАРШАВА, 18. Учора агалошан выбарчы сьпіс манархістых, які абымае 100 асоб. Начале гэтае групы—вядомы манархіцкім дыбр—праф. Парэўскі з Вільні.

НАЧНОЕ РАДЫЕ

Арышт трох пагромшчыкаў савецкай выстаўкі.

ПАРЫЖ, 19. У Брусэлі арыштавана трое маладых людзей, якія бралі ўдзел у разгроме савецкай выстаўкі. Адзін з арыштаваных—блізкі сваяк бэльгійскага пасланьніка пры Ватыкане. Арыштаваным прад'явлена абвінавачваньне па артыкулах, па якіх прадугледжваецца кара: для застрэльшчыкаў—ад 10 да 15 год катаржных работ, а для выканаўцаў злачынскага акту—ад 1 да 5 год турмы.

Краіны Лацінскай Амэрыкі супроць інтэрвэнцыі Зл. Штатаў у Нікарагуа.

НЬЮ-ЁРК, 19. Друк краін Лацінскай Амэрыкі патрабуе, каб на абмеркаваньне канфэрэнцыі было пастаўлена пытаньне аб Нікарагуа. Зьезд працаўнікоў грамадзкіх арганізацый Чылі, які адбыўся ў Сант-яго (сталіца Чылі) ухваліў рэзалюцыю пратэсту супроць інтэрвэнцыі Зл. Штатаў у Нікарагуа. Кампартыя Кубы апублікавала адозву, у якой выкрывае імпэрыялістычны характар канфэрэнцыі, якая адбываецца ў Гаваньне, а асабліва імпэрыялістычную ролю Зл. Штатаў.

Кулідж вярнуўся ў Зл. Штаты.

НЬЮ-ЁРК, 19. Сёньня Кулідж вярнуўся з Гаваны у Зл. Штаты.

У нядзелю, 22 студзеня, а 11 гадзіне зранку ў антавай залі Камвузу адбудзецца чарговая лекцыя ў Нядзельным Камвузе на тэму: „Праблемы культурнай рэвалюцыі“. Лектар—тав. КНОРЫН.

Літаратура да лекцыі: мінімум: Ленін. т. XVIII, ч. II. Старонкі з дняўніка і аб каапэрацыі.

Максымум: Кнорын—Культура і культурніцтва—Кампрэвалюцыя № 7, за 27 г. ці зборнік—Упадніцтва сярод моладзі—есэнішчына.

ЖЫЦЬЦЁ ПАРТЫІ

РАБОТА СЯРОД СЯЛЯНАК

Да пастаноў XV партзьезду

Тав. Молатаў у сваім дакладзе «Аб працы ў вёсцы» на XV партзьезьдзе сказаў:

«У нас вялізарныя магчымасьці для разгортваньня работы сярод жанчын вёскі, але і гэта справа знаходзіцца далёка не ў такім становішчы, каб лічыць гэту галіну партыйнай работы здавальняючай. У нас мілёны батрачак, бяднячак і сераднячак, якія павінны даць магутнае папаўненьне радоў сацыялістычных будаўнічых у вёсцы... Нам абсалютна неабходна задачу на ўцягненьні жанчын вёскі ў кааперацыю, саветы і г. д. паставіць сапраўды ў масавым маштабе, усляк дапамагаючы пасунуць яе ўперад больш шпаркім тэмпам, чым да гэтага часу».

XV партзьезд высунуў асноўны лёзунг у рабоце партыі ў вёсцы — задачу масавай калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Гэтай задачы павінна быць падпарадкавана ў асноўным работа партыі сярод шырокіх мас сялянак.

Да гэтага часу работа сярод сялянак носіць яшчэ культурніцкі ўхіл, ня гледзячы на цэлы рад паказаньняў аб пераходзе на эканамічныя рэйкі работы. Пытаньні ўцягненьня сялянак бяднячак, батрачак і сераднячак у работу па перабудове сельскай гаспадаркі ўсё яшчэ займаюць мала месца ва ўсёй рабоце партыі сярод сялянак. А між тым сялянка ў цэлым радзе галін сельскай гаспадаркі займае дамінуючае нічэньне. Даныя аб удзеле жанчын у рабоце па Ленінградзкай губэрні даюць наступны малюнак:

Удзел сялянак у земляробчай рабоце раёнаецца 34,5 проц., сенажаці 40 проц., па жывёлагадоўлі — 67,5 проц., прапрацоўцы с.-г. прадуктаў — 99 проц. і птушніцтве — 95 проц.

У нас, на Беларусі удзел у рабоце сялянкі ў сельскай гаспадарцы яшчэ вышэйшы, бо значна павышаецца ўдзел у рабоце сялянак па вырашчваньні бульбы, па гароднічтве, на жывёлагадоўлі.

Усё гэта гаворыць аб тым, што неабходна зараз-жа зрабіць пералом ва ўсёй працы сярод сялянак, прыстасаваць усе існуючыя формы работы да асноўнай задачы — папаўненьне радоў будаўнікоў сацыялістычных форм гаспадаркі ў вёсцы.

Возьмем работу дэлегацкіх сходаў у вёсцы. Дэлегацкія сходы зьяўляюцца асноўнай, сябе апраўдаўшай, формай работы партыі сярод працоўных жанчын. Колькасьць дэлегатак у вёсцы з году ў год расьце. Мы цяпер маем 28.000 дэлегатак, якія праходзяць гадовую школу грамадзкай работы ў 865 дэлегацкіх сходах, якія праводзяць сваю работу пад кіраўніцтвам партыйных ячэек. У дырэктывах, што даны ЦК КП б)Б па пытаньні аб рабоце дэлегацкіх сходаў, удзелена асаблівае месца пытаньню па ўцягненьні дэлегатак у практычную дзейнасьць, уцягненьні іх да ўдзелу ва ўсім грамадзка-гаспадарчым жыцьці вёскі, павышэньне ролі дэлегацкага сходу, як грамадзкай адзінкі на сяле.

Ці выконваюць дэлегацкія сходы гэту задачу? — Далёка ня ўсе. У нас ёсьць прыклады вельмі добрай работы дэлегацкіх сходаў у гэтым напрамку. Так, напрыклад, у Касьцюковіцкім раёне дэлегаткі пры дапамозе ячэйкі ЛКСМ засадзілі калектыўна гарод, усё лета глядзелі за ім. У гародзе вырас вельмі добры турнэпс, прыбытак з якога пашоў на яслі. У ячэйцы Вендараж, Магілеўскага раёну, дэлегаткі зьявілі пытаньне аб арганізацыі ільнамяльнай арцелі, пры чым тутжа вылічылі, што калі арганізаваць гэтую арцель у ліку 30 дэлегатак, дык ім прыдзецца на працягу трох год адзін раз у год плаціць па 80 кап., таму што машына каштуе 70 руб., пры чым можна атрымаць на тры гады адтэрмінаваньне. Ільнамяльная-ж машына ў многа раз палепшыць і прысьпешыць працу сялянак. У часе ясельнай кампаніі ўсе дэлегацкія сходы бралі атыўны ўдзел у арганізацыі ясляй і пляцовак, засявалі гароды, шылі бялізну для дзяцей, бралі ўдзел у прыбраньні памяшканьняў і г. д.

Такіх прыкладаў шмат. Але побач з гэтым абсьледваньне работы дэлегацкіх сходаў выяўляе, што цэлы рад з іх працуе яшчэ па-старому. Прыдзе дакладчык, прачытае даклад, ня ўвязаны з мясцовымі пытаньнямі вёскі. Іншы раз зададуць пытаньні сялянкі і «не па сутнасьці» да вялікай прыкрасьці дакладчыка, гэта значыць, закранаюць пытаньні, зьвязаныя з жыцьцём і бытам сяла. Пасядзяць, пагавораць крыху і разыдуцца. Гэта ўжо зусім дрэнна працуючыя дэлегацкія сходы. Большасьць дэлегацкіх сходаў працуе лепш. Замест дакладу праводзіцца гутарка з дэлегаткамі.

Алё нават і такія дэлегацкія сходы не апраўдваюць свайго прызначэньня. Вельмі часта сялянкі ў такіх дэлегацкіх сходах не знаходзяць патрэбнай зацікаўленасьці. Галоўная бяда работы дэлегацкіх сходаў у вёсцы — гэта адарванасьць ад задач [illegible] ня сельскай гаспадаркі і ў прыватнасьці тых галін, дзе ўжываецца ў асноўным праца сялянак. Неабходна зараз жа пераглядзець мэтады работы дэлегацкіх сходаў у вёсцы, адпаведна да задач, якія вы сунуты 15-ым партзьездам.

Кожны дэлегацкі сход у вёсцы павінен мець акрэсьленую мэтавую ўстаноўку, г. зн. паставіць сабе задачай сіламі саміх дэлегатак правесьці ».ацыя-б адно практычнае мерапрыемства па калектывізацыі, па каапэраваньні першапачатковых вытворчых працэсаў у сельскай гаспадарцы, па паляпшэньні пастаноўкі тых галін сельскай гаспадаркі, у якіх працуе ў асноўным сялянка.

Кожны дэлегацкі сход у залежнасьці ад эканамічных умоў данага раёну, ад таго, што больш магчыма выканаць у даных умовах, павінен узяць на сябе задачу правесьці, з пачатку сіламі дэлегатак, а потым і ўцягваючы рэшту сялянак, работу па арганізацыі малочнай ці птушніцкай арцелі, па засеве грамадзкага гароду, па арганізацыі ясляў, пляцовак, арганізацыі арцеляй па сумеснай першапачатковай апрацоўцы ільну, шляхам набыцьця на калектыўных падставах ільнамялкі, трапалкі ці іншых машын. При дапамозе аграномаў узяцца за паляпшэньне пастаноўкі ў гаспадарках дэлегатак спосабаў апрацоўкі паасобных расьлін ці паляпшэньня гатунку і кармёжкі жывёлы. Ясна, што ня трэба раскідацца, узяцца за адно, але яго правесьці да канца. Само сабой зразумела, што дэлегацкі сход павінен быць адначасова падбухторшчыкам і ў такіх пытаньнях, як сам абкладаньне сялянства, падпіска на сялянскую пазыку, барацьба з самагонакурэньнем, барацьба з знахарствам, забабонамі.

Гэтая задача будзе выканана толькі тады, калі ячэйка будзе накіроўваць работу дэлегацкіх сходаў, уваходзячы ў падрабязнасьць паасобных частак яго работы.

Усё сказанае тут датычыць у першую чаргу дэлегацкіх сходаў, але, зразумела, усе формы работы сярод сялянак павінны быць таксама перабудаваны. Практычную ўстаноўку ў рабоце трэба палажыць у аснову дзейнасьці гурткоў кройкі і шыцьця, гурткоў домаводзтва, падпарадкаваць гэтай задачы таксама масавую работу сярод сялянак. Толькі тады, калі мы адмовімся ад «чыста-культурніцкіх» мэтадаў работы, мы ўцягнем шырокія масы [illegible] ня сельскай гаспадаркі [illegible] лёзунгу XV партзьезду. **Крэмер.**

Парт'ядро ў камсамоле

(Капыльскі раён, Меншчына)

Ад становішча парт'ядра ў камсамоле і ад якасьці парткіраўніцтва камсамольскай арганізацыяй залежыць у значнай меры тое, наколькі КСМ зьяўляецца актыўным удзельнікам ва ўсёй палітычнай і грамад ка-гаспад рчай пр цы партыі.

Капыльскі райком КП(б)Б, прапрацоўваючы пытаньні аб становішчы і росьце парт'ядра ў камсамольскай арганізацыі, адзначыў, што за 1927 год парт'ядро ўзрасло з 5-7 ч. (1926 г.) да 31 чал. (1928 г.), якое па сацыяльным стане падзяляецца так: рабочыя 42 проц., сяляне-беднякі — 12,9 проц., сераднякі і служачыя — 12,9 проц.

Камсамольская арганізацыя раёну ў працягу году зьяўлялася галоўным рэзэрвам адкуль райпартарганізацыя чэрпала новыя сілы. Т к, з ліку прынятых у партыю за 1927 г. 27 чал. 19 чал. ці 70,3 проц. прайшло праз камсамол. У партыю перадаваліся камсамольцы, якія прайшлі школу грамадзка-камсамольскай працы. Так, у ліку камсамольцаў-партыйцаў — 6 чал. — сакратары яч. КСМ, 8 чал. — члены бюро яч. КСМ, 11 чал. — актыўныя грамадзкія працаўнікі 1 партпрацаўнік і толькі 5 чал. нясуць у камсамоле часовыя нагрузкі. Дрэнна справа ў тых камсамольскіх ячэйках, якія знаходзяцца далёка ад партыйных ячэек, дзе, ня гледзячы на тое, што маюцца палрыхтаваныя камсамольцы, якіх хутка можна перадаць у партыю, але якім амаль немагчыма знайсьці рэкамэндацыю. З боку некаторых камсамольцаў партыйцаў (адзінак) маецца тэндэнцыя адыйсьці ад працы ў камсамоле. Галоўн е, чаго неабходна дабіцца, каб адказным за працу ў камсамоле быў ня толькі камсамолец партыец, непасрэдна працуючы на камсамольскай працы, а камсамолец — партыец наогул. З мэтай далейшага палепшэньня працы парт'ядра райком КП(б)Б з райкомам ЛКСМБ у хуткім часе склікае нараду парт'ядра з партпрымацаванымі. **Міх. Маслоўскі.**

Ад ангельскай блюзкі да... палітэканоміі

(Ячэйка КП(б)Б ВСНГБ, Менск)

Кантынгэнт прапаўнікоў, якіх абслугоўвае ячэйка, у большасьці свайё складаецца з інжынераў, эканамістых, фінансістых, тэхнікаў, камэрсантых, розных спэцыялістых, аказаных [illegible] паўнікоў і з невялікай парэшткай часткі радавых нізэйшых служачых.

Таму трудна было сабе прадставіць якую-небудзь палітычную працу сярод жапочай палавіны і жонак гэтых працаўнікоў, якія адрозьніваюцца інтэлігенцкім укладам жыцьця і катняга быту.

За гэту цяжкую задачу, аднак, бюро ячэйкі ўзялося і трэба сказаць, што перш пачатак зроблены.

Пачалося з арганізацыі двух гурткоў кройкі і шыцьця.

Вестка аб арганізацыі пры ячэйцы гэтых гурткоў шпарка распаўсюдзілася сярод супрацоўнік і хатніх гаспадынь і ўжо на першых заняткох можна было наглядаць цікавы малюнак, як за хоўгіх радам сталоў каля 30 жанчын, узброеных іголкаю і напярсткам, разьмясьціліся са сваімі рознакалярovымі матар'ялямі, папяровымі выкрайкамі, ножніцамі і сантымэтрамі.

Шумная гутарка, вясёлы здаровы сьмех, выкрыкі хутчэй нагадваюць вечар спайкі, чым вывучэньне крою ангельскай блюзкі.

Зьяўленьне выдучанага ячэйкаю кіраўніка палітгуртка ў суправаджэньні апорга ўносіць спачатку некаторую замешку, але першыя яго словы аб неабходнасьці ўстанавіць палітгадзіну сустракаюцца вельмі спрыяюча і ў выніку два разы ў тыдзень 40-50 чалавек адкладваюць на 40-50 хвілін свае кравецкія прылады і ўважліва слухаюць, запісваюць у свае сшыткі і вывучаюць элементарныя веды з палітэканоміі, асноўныя паняцьці аб разьвіцьці гаспадарчых форм і як камуністычная партыя павукова ўгрунтоўвае сваю праграму — камунізм і сваю тактыку — шляхі і сродкі барацьбы за камуністычнае грамадзтва. **Брандабоўскі.**

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

ПА ТЭЛЕГРАФУ, ТЭЛЕФОНУ І ПОШТАЙ ПА НАШЫХ КАРЭСПАНДЭНТАЎ

Канфэрэнцыі яўрэяў-земляробаў

МАЗЫР. (Уласн. кар.). У шасьці раёнах акругі былі нядаўна праведзены канфэрэнцыі яўрэяў-земляробаў. Канфэрэнцыі праведзены ў мэтах вылучэньня становішча калектыўных і індывідуальных гаспадарак яўрэяў-земляробаў, у сувязі з прадстаячым Усебеларускім зьездам працоўных яўрэяў.

Канфэрэнцыі прайшлі актыўна. Удзельнікі канфэрэнцыі досыць правільна ацанілі дасягненьні і недахваты ў працы па надзяленьні працоўных яўрэяў зямлёй і па перасяленьні.

Як буйное дасягненьне, трэба адзначыць, што на ўсіх канфэрэнцыях з боку **індывідуальных гаспадарак было выяўлена вялікае імкненьне да пераходу на калектыўную апрацоўку зямлі.**

Адзін з удзельнікаў Пятрыкоўскай канфэрэнцыі, гаворачы аб дасягненьнях, сказаў наступнае:

— Лепшых дасягненьняў ня трэба, калі я жыву ў тым пакоі, які абшарнікам быў прыстасаваны выключна графу, які прыяжджаў да яго ў госьці. Жыву я на яго зямлі, працую, маю хлеб і ніхто мяне ня турбуе.

Да недахватаў у працы калектываў трэба аднесьці: бягучасьць складу некаторых калектываў і ня досыць уважлівыя адносіны на мясцох пры іх укамплектаваньні. Ёсьць яшчэ і зараз такія моманты, калі ў калектывы пралазяць розныя гандляры для таго, каб знайсьці сабе «лёгкі хлеб». Такі элемант не ўзмацняе, а перашкаджае працы.

У абслугоўваньні калектываў мясцовымі органамі было адзначана, што ўвага ўзмацнілася, а з боку аграноміі ёсьць выпадкі, калі яна едзе толькі ўладжваць канфлікты, а не дапамагаць у працы.

Амаль што ўсе выступаўшыя на мінулі пытаньня аб неабходнасьці ўзмацненьня культурнай працы сярод калектывістых. **Б. Ш.**

Пашырэньне жылбудаўніцтва ў Слуцку

СЛУЦАК. (Уласн. кар.). Новае жыльлёвае будаўніцтва ў горадзе распачата ў 1926-27 годзе. Водпуск камунальнага крэдыту ў суме 70.000 р. даў магчымасьць пабудаваць 4 новыя дамы, з якіх 3 дамы ўжо заселены 17 сем'ямі. На будучы год зроблена заяўка на атрыманьне камунальнага крэдыту ў суме 15.000 р., на якія намечана пабудаваць яшчэ 2 дамы.

Будаўнічая каапэрацыя гораду належным чынам сваёй працы не разгарнула, адначасова з гэтым яна перажывае фінансавы крызіс; пайшчыкаў налічваецца толькі 10, уласныя капіталы складаюць 385р.

Агульнымі недахватамі новага жылбудаўніцтва гораду зьяўляюцца: ня зусім адпавядаючая канструкцыя дамоў як знадворная, так і ўнутраная, што не дае магчымасьці правільнаму разьмеркаваньню жылплошчы.

Дрэнным зьяўляецца і да гэтага часу якасны бок жыльлёвай плошчы. Праведзеныя па горадзе капітальныя рамонты мала закранулі жылыя дамы: большасьць сродкаў, адпушчаных на капітальныя рамонты, пайшла на рамонт памяшканьняў пад установы і грамадзкія арганізацыі (дом культуры, пажарная каманда).

На 1927-28 год намечана затраціць на камунальныя рамонты 18.157 р., пры чым 9.157 руб. намечана скарыстаць на рамонты жылых камунальных дамоў. **Я.**

Работа ЦРК на абгаварэньне мас

ГОМЕЛЬ (Уласн. кар.). У сучасны момант на прадпрыемствах Гомелю праводзіцца справаздача Цэнтральнага рабочага каапэратыву. Даклады прадстаўнікоў праўленьня ЦРК вельмі цікавяць шырокія масы пайшчыкаў.

З якім актывам выступае ЦРК перад рабочымі? Ня гледзячы на недахоп тавараў, ЦРК за апошні год павялічыў свае звароты ад 5.676.000 руб. да 6.800.000 р., дабіўся павялічэньня нагрузкі гандлёвых служачых да 3.058 руб. у месяц, ня гледзячы на зьніжэньне цэн, атрымаў 39.000 руб. прыбытку. Не малым посьпехам зьяўляецца тое, што за апошні год ЦРК правёў па клюбах і прадпрыемствах 80 сходаў, гутарак і вечароў пытаньняў і адказаў.

А вось і пасыў ЦРК. Ён ня выканаў дырэктыву Акрпрафсавету аб гандлі с.-г. прадуктамі. Дзякуючы адсутнасьці ўплыву каапэрацыі, цэны на гародніну на рынку растуць з кожным днём.

Процант пайшчыкаў ЦРК па асобных саюзах яшчэ вельмі малы — у друкароў — 48 проц., будаўнікоў — 37,7 проц. Хлебапякарня ЦРК не здавальняе запатрабаваньняў гораду, трэба пабудаваць мэханізаваны хлебны завод. Уласныя сродкі ЦРК складаюць толькі пязначную частку звороту. Трэба дабіцца павялічэньня разьмеру паю да 15 руб. Трэба пракесьці ў жыцьцё арганізацыю чайных у Гомелі і ў Нова-Беліцы. **Юдзіцкі.**

Дрэннае становішча школ

ПЛЕШЧАНІЦЫ. (Улас. кар.). Наш раён налічвае 54 чатырохгодкі, з іх уласнымі будынкамі забясьпечана 37 школ або 68 процантаў.

Дрывамі школы забясьпечаны зусім кепска. Школьнае абсталяваньне таксама нездавальняючае. Лавак для вучняў не хапае. Па некаторых школах пішуць, седзячы на падлозе або прылажыўшы сшыткі да сьцяны.

Кепска стаіць справа з мэтадычным кіраўніцтвам. Мэтбюро ў раёне не арганізавана, ніякіх сходаў па гэтым пытаньні ніколі ня робіцца.

Бракуе ў нас і падручнікаў. Настаўнік прыяжджае ў раён і просіць 15-20 кніг, а даюць яму толькі 3—5.

Шмат у нас гаварылі і пра абавязковае навучаньне, але яно ў раёне ня ўведзена. Таксама ненармальна прайшло і камплектаваньне школ. Ёсьць двухкамплектовыя школы з 28 вучнямі. Непадрыхтавана пытаньне аб адкрыцьці новых камплектаў. Яны адкрыты там, дзе ня трэба, а дзе патрэбны школы, там іх няма.

Райвыканком даваў загад прымаць вучняў пасьля першага кастрычніка, а перад гэтым не праведзена ніякай кампаніі аб пачатку заняткаў у школах.

У выніку гэтага лік вучняў па школах значна паменшыўся. Школы рамонтуюцца, а кватэры настаўнікаў не. Разьмеркаваньне і выдача школам падручнікаў зроблена з вялікім спазьненьнем.

Наогул становішча школ у нашым раёне чакае значнага паляпшэньня. **Г. М.**

Адусюль

— 21 студзеня ва ўсіх гарадзкіх школах Гомелю будуць праведзены ранішнікі, прысьвечаныя гадавіне сьмерці У. І. Леніна.

— На Мазырскай электрастанцыі вясной будуць пастаўлены дзьве новыя машыны ў 300 конскіх сіл.

— З 10 лютага ў г. Воршы адкрываюцца курсы па падрыхтоўцы ў ВНУ і рабфакі.

— Акруткамунгас Гомелю закупіў у Маскве 4 вялікія дваццацічатырохмясцовыя аўтабусы. Аўтабусы пушчаны ў ход.

— На гарадзкім камбінаце ў Мазыры ўстаноўлен новы паравы кацёл у 100 квадратовых метраў нагрэву.

— Прэзыдыум Гомельскага Гарсавету разам з мандатнай камісіяй правяраюць, хто з членаў гарсавету ня прымае ўдзелу ў рабоце сэкцый.

— У хуткім часе ў Мазыры пачне працаваць новая артэзыянская студыя. Заканчваецца набудова фільтру.

Рашучыя меры — да злосных неплацельшчыкаў

НЕПЛАЦЕЛЬШЧЫКІ — КУЛАКІ І ЗАМОЖНЫЯ

Як ідзе паступленьне с.-г. падатку

На 15-га студзеня паступіла с.-г. падатку па ўсіх акругах Беларусі (Гомельская толькі на 14-та студзеня) 6.834.467 руб.

На асобных акругах процант выкананьня гадавога заданьня мелася ў наступным відзе: Мазырская округа — 82,3 проц., Аршанская — 81,4 проц., Бабруйская — 81,3 проц., Віцебская — 80,3 проц., Полацкая — 80,1 проц., Магілеўская — 78,7 проц., Менская — 72,5 проц. Такім чынам асабліва адстаюць Менская, Магілеўская і Гомельская округі.

Агульнае выкананьне заданьняў па Беларусі, акрамя паступленьняў з Гомельшчыны, за зімнія два тыдні складае 76,7 проц., а разам з Гомельшчынай гэты процант дойдзе прыблізна да 80 проц.

Між тым, другі тэрмін плацежу с.-г. падатку скончыўся 1-га студзеня, а трэці тэрмін заканчваецца 1-га сакавіка.

Паступленьне падаткаў павялічылася

ГРЭСК. (Уласн. кар.). Сельска-гаспадарчы падатак у нашым раёне выконваецца здавальняюча. Першая і другая раты выкананы цалком. За трэцюю рату паступіла 1.127 руб. Горш абстаіць справа на паасобных сельсаветах. Грэскі сельсавет ня выканаў 1.874 р., Грозаўскі — 1.000 руб.

Гэта гаворыць аб тым, што сельсаветы, якія заплацілі ўжо за трэцюю рату закрываюць сабой дрэнныя сельсаветы, якія плацяцца ў хвасьце.

Трэба, каб сельсаветы перадалі ў суд справы аб злосных неплацельшчыках і маглі прынялі рэпрэсыўныя меры.

Інакш, як нядбайнасьцю органаў улады, растлумачыць нельга

МАЗЫР. (Уласн. кар.). Паступленьне сельска-гаспадарчага падатку па акрузе ў апошнія часы ўзмацнілася. У сучасны момант рад раёнаў падыйшлі да 100-процантнага выкананьня.

Горш абстаіць справа з спагнаньнем страхоўкі, выкананьне якой на 1-га студзеня 1928 году складае па акрузе толькі 25,7 проц. заданьня, а па некаторых раёнах — нават 16-17 проц.

Тут, бязумоўна, трэба адзначыць, што страхавыя працаўнікі на мясцох мала зьвярталі ўвагі на своечасовае спагнаньне страхоўкі.

Сельсаветчыкі ня хочуць сварыцца з заможнікамі

Магілеў. (Уласн. кар.). За ліквідацыі недаступіла сельска-гаспадарчага падатку па акрузе каля 100 тыс. р. Яшчэ большую суму складаюць недаступленьні па страхавых выплатах.

У чым крыецца прычына гэтага і хто неплацельшчык?

Сёлета ўся беднота цалком звольнена ад падатку, а больш незаможная частка сераднякоў атрымала частковае звальненьне. Такім чынам ня ўносяць падатак тыя-ж плацельшчыкі, якія могуць яго заплаціць.

Гэта пацьвярджаюць зробленыя абсьледваньні.

Так, па Радамскім сельсавеце ёсьць неплацельшчыкаў 190 — каля 35 проц. усіх гаспадарак. І вось сярод гэтых 190 гаспадарак налічваецца 89 такіх, якія маюць па 3—4—5 і больш галоў жывёлы. Заможны плацельшчык затрымлівае ўзнос падатку, а гледзячы на яго не нясе падатку і радавы серадняк. Адгэтуль вынікае і асноўная мера па ўзмацненьні паступленьня падатку.

Трэба злосных заможных неплацельшчыкаў аддаваць пад суд.

Зроблены ўжо адпаведныя ўказаньні сельсаветам і райвыканкомам. Трэба адзначыць і другарадныя прычыны невыкананьня падатку. Сельсаветы чакалі перавыбараў, дзякуючы чаму вядомая частка сельсаветчыкаў у вядомых мэтах не жадала сварыцца з людзьмі, у некаторых мясцох чакалі таксама нейкіх «усеагульных» ільгот. **Лапцеў.**

ДА ЯРАВОЙ ПАСЕЎНАЙ КАМПАНІІ

Асноўнай задачай пасеўнай кампаніі зьяўляецца далейшая рэканструкцыя сялянскай гаспадаркі на падставе пашырэньня пасеваў траў, як базы для разьвіцьця жывёлагадоўлі і пашырэньня пасеваў працаёмкіх тэхнічных культур.

Неабходныя валютныя рэсурсы для індустрыялізацыі краіны павінны чарпацца, галоўным чынам, у бліжэйшыя гады шляхам экспарту лішкаў прадукцыі сельскае гаспадаркі, у тым ліку і прадукцыі збожжавых культур.

Усё гэта гаворыць за неабходнасьць стала і энэргічна падыйсьці да правядзеньня падыходзячай пасеўнай кампаніі і з бясьпечыць у дастатковым разьмеры сельскую гаспадарку належным насеньнем, угнаеньнямі і інвэнтаром.

Па пляне Наркамзему мяркуецца загатовіць наступную колькасьць насеньня (у тоннах*): канюшыны — 541,5, цімафейкі — 88, вікі — 1.230, сэрадэлі — 246, лубіну — 1.328, ільну-даўгунцу — 1.050, кораньплодаў — 83,6, палепшанага аўсу — 2.200, півавар. ячменю — 448.

Супроць мінулага году загатоўка насеньня ільну-даўгунцу павялічана на 100 проц., канюшыны — на 32 проц.

Некалькі горш абстаіць справа з загатоўкаю вікі, сэрадэлі і лубіну.

Загатоўшчыкі сваячасова не распачалі загатовак вікі, і цэны ў сувязі з агульнай напружанасьцю рынкавай кан'юнктуры падняліся да 1 р. 50 к. — 1 р. 70 кап. за пуд.

На завоз насеньня ільну даўгунцу, кораньплодаў і гароднага насеньня заключаны дагавары і, магчыма, што гэтае насеньне паступіць у раёны сваячасова. Некалькі цяжка будзе абстаіць справа з завозам і загатоўкай насеньня аўсу. Меркаваньне Наркамзему атрымаць насеньне аўсу з цэнтральных губэрань Саюзу пакуль што яшчэ ня вырашана.

Неабходна будзе нашым загатоўчым органам узмацніць загатоўкі аўсу на мясцовым рынку.

Па лініі Наркамгандлю даны заданьні хлебазагатоўшчыкам нагатаваць і забраніваць насеньня аўсу і ячменю, а па лініі Белсельбанку ў акругі пераведзены сродкі па мясцовыя загатоўкі насеньня аўсу.

Але і самому сялянству неабходна памятаць, што цьвёрдых надзей на атрыманьне насеньня аўсу няма, а таму свае запасы **насеньня аўсу сялянства павінна расходваць ашчадна, інакш можа быць здарэньне, што ня будзе чым засеяць яравы клін.**

Калі ў адносінах пасеўнай плошчы па ўсіх культурах мы ўжо перавысілі даваенныя разьмеры, дык у адносінах ураджайнасьці па некаторых культурах яна пакуль што ніжэй даваеннай, **а таму праблема пашырэньня збожжавай базы на падставе павышэньня ўраджайнасьці і тэхнікі апрацоўкі глебы застаецца і на даўлейшы час.**

Вось чаму задача — забясьпечыць насельніцтва сродкамі ўгнаеньня і палепшанага сельска-гаспадарчага інвэнтару ў пасеўную кампанію набывае вялікую значнасьць.

Рэальна мяркуецца завезьці наступную колькасьць мінэральных угнаеньняў у 1927-28 г. (у тонах): суперфасфату — 12.300, тамасаўкі — 4,110,5 касьц. мукі — 2.714, калійнае солі — 2,498,5, фасфар. мукі — 1,643, азот. угнаеньняў — 198.

У адносінах забясьпячэньня насельніцтва сельска-гаспадарчымі машынамі і прыладамі, дык плянам прадугледжваецца завезьці ў раёны на працягу 1927-28 году розных сельска-гаспадарчых машын і інвэнтару на 4.351.941 руб.; для правядзеньня-ж пасеўнай кампаніі павінен паступіць у раёны ў дастатковай колькасьці паступны інвэнтар: плугі, бароны, акучнікі, палольнікі, культыватары, пасеўныя і зернаачышчальныя машыны і спэцыяльныя машыны па мэліярацыі і культуры балот. Ільготныя ўмовы крэдытаваньня на сельска-гаспадарчыя машыны для бяднейшых, калектыўных гаспадарак і машынных таварыстваў дапамогуць забясьпечыць безінвэнтарныя гаспадаркі належнымі машынамі і прыладамі і выкліча стымул арганізацыі машынных таварыстваў.

Да правядзеньня яравое кампаніі неабходна прыступіць рашуча па ўсіх лініях веморганаў, каапэрацыі і камітэтаў сялянскай узаемадапамогі.

Карэўнікаў.

*) Тонна 976 кілёграм.

Вясковая парт'ячэйка на гаспадарчай рабоце

Канец

Але агульным удзелам у рабоце па разьвіцьці і палепшаньні сельскае гаспадаркі ня вычэрпваюцца задачы ячэек у галіне кіраўніцтва гаспадарчым жыцьцём вёскі. **Галоўная ўвага ячэек павінна быць зьвернута на разьвіцьцё калектыўных форм у сельскай гаспадарцы**, «усяляк дапамагаючы і рашуча разгортваючы работу па арганізацыі прасьцейшых, найбольш зразумелых сялянству і праверaных на практыцы аб'яднаньняў, як машынныя, мэліярацыйныя і г. д. таварыствы. Для ілюстрацыі падаем весткі па некалькіх ячэйках: Лудчыцкая ячэйка, Магілеўскае акругі, дабілася арганізацыі машыннага таварыства, Нікановіцкая ячэйка, Магілеўскае акругі, правяла работу сельска-гаспадарчай арцелі, выжыла адтуль кулака, дабілася пераходу на шматпольле аднаго калгасу, Прудзінкоўская ячэйка, Полацкае акругі, арганізавала машыннае і мэліярацыйнае таварыствы, працуе над арганізацыяй сельска-гаспадарчае арцелі і ільнаводнага таварыства, Хоцінская ячэйка, Полацкае акругі, арганізавала машыннае і мэліярацыйнае таварыствы; тое самае наглядаецца ў Целяшоўскай ячэйцы, Гомельскае акругі, Гарадзішчанскай, Магілеўскае акругі, Юзэфаўскай, Полацкае акругі і г. д.

Гэтыя прыклады тым больш паказальныя, што арганізацыя новых аб'яднаньняў, нават самых простых, для ячэек зьяўляецца работаю нялёгкаю. Напрыклад, Хоцінская ячэйка вяла падрыхтоўчую работу да арганізацыі мэліярацыйнага таварыства ў працягу некалькіх месяцаў. Пытаньне аб таварыстве прапрацоўвалася ў групе беднаты, на пасяджэньнях сельсавету, на сходах у шасьці вёсак, на сходах беднаты і толькі ў выніку такой упартай работы ячэйкі, удалося афармліць таварыства.

Неабходна ўсямерна заахвочваць і падтрымліваць ініцыятыву ячэек у арганізацыі машынных і іншых таварыстваў, якія зьяўляюцца зародкам калектыўнае гаспадаркі.

У справе калектывізацыі сялянскіх гаспадарак вялікае значэньне мае прыклад ужо існуючых калгасаў. Таму палепшаньне работы калгасаў павінна зьяўляцца адной з першачарговых задач ячэек. На справе-ж ячэйкі вельмі мала зьвяртаюць увагу рабоце ў калгасах. Асабліва слаба пастаўлена палітвыхаваўчая работа ў калгасах, а ў некаторых мясцох і зусім не праводзіцца.

У справе рэарганізацыі сялянскіх гаспадарак, вялізная роля належыць каапэрацыі. 15-ты партзьезд наступным чынам характарызуе значэньне каапэрацыі.

«Побач з вялізным эканамічным значэньнем каапэрацыі наогул і сельска-гаспадарчай каапэрацыі ў асаблівасьці, неабходна адзначыць, што каапэрацыя зьяўляецца найлепшай формай эканамічнага масавага аб'яднаньня сялянства, разьвіцьця яго самадзейнасьці і ініцыятывы, формай [illegible] гаспадарчага і культурнага палітычнага перавыхаваньня, уцягненьня ў рэчышча агульна-сацыялістычнага будаўніцтва...»

Такое вялізнае значэньне каапэрацыі ў асноўным сельячэйкамі ўсьвядомлена. Гэта відаць з таго, што пытаньні каапэрацыі на колькасьці займаюць самае вялізнае месца ў рабоце ячэек у галіне кіраўніцтва гаспадарчым жыцьцём вёскі. Так, напрыклад, з 36 абсьледваных ячэек, толькі 3 не заслухоўвалі дакладаў аб рабоце сваіх каапэратываў. Пры гэтым трэба адзначыць, што якасьць кіраўніцтва каапэрацыяй таксама крыху палепшылася, хоць недахватаў у гэтым кіраўніцтве яшчэ вельмі шмат. Многія ячэйкі праводзяць вялізную работу па ўцягненьні найшчыкаў і па каапэраваньні беднаты.

Напрыклад: Прудзінкоўская ячэйка займалася пытаньнямі аб палепшаньні работы сельска-гаспадарчага малочнага таварыства і дабілася наступных дасягненьняў: лік найшчыкаў павялічыўся з 47 да 86, выраб масла павялічыўся з 50 да 130 пудоў, паявы капітал павялічыўся на 80 проц., набыт новы інвэнтар (сэпаратар, малатарня, арфа і інш.). Хоцінская ячэйка правяла работу па аздараўленьні спажывецкага таварыства, якое раней працавала вельмі дрэнна, вясьпала пытаньне аб абгарнізацыі сельска-гаспадарчага крэдыту нага таварыства і правяла гэта ў жыцьцё.

Усе ячэйкі, за некаторым выключэньнем, праводзілі работу **па каапэраваньні беднаты.** Многія ячэйкі прапрацоўвалі пытаньні аб каапэраваньні беднаты на партдзёх і на сходах і групах беднаты. Наогул-жа работа ў гэтым кірунку разгорнута слаба. Мае месца таксама павольнасьць у выкарыстаньні фондаў каапэраваньня, няпоўнае іх выкарыстаньне, мэханічнасьць каапэраваньня.

Невыстарчальную ўвагу зьвяртаюць некаторыя ячэйкі на кантроль за правядзеньнем выразнай клясавай лініі ў рабоце каапэратыву. Таму ў некаторых каапэратывах наглядаецца адсутнасьць досыць выразнай клясавай устаноўкі ў рабоце: дрэнна пастаўлен падлік сацыяльнага складу найшчыкаў, няпоўнасьцю і павольна выкарыстоўваюцца фонды каапэраваньня беднаты, наглядаюцца выпадкі няправільнага разьмеркаваньня крэдыту.

Далёка невыстарчальна ячэйкі праводзяць работу па **зьніжэньні цэн** у каапэрацыі. Пытаньне гэта ня поўна папулярызавана сярод насельніцтва, мабілізаваць у патрэбнай меры вясковую грамадзкасьць вакол гэтае задачы ячэйкі не змаглі.

Самым слабым месцам у кіраўніцтве ячэек каапэрацыяй зьяўляецца работа па **прыцягненьні сродкаў насельніцтва:** мала ўвагі аддаецца разьвіцьцю ўкладных аперацый, павялічэньню разьмеру паю, дадатковага спагнаньня паявых узносаў і г. д.

І. Дорахаў.

СЯЛЯНЕ АБ «СУХЭНІ» № 0

БЕЛСЕЛЬСАЮЗ І СЯЛЯНЕ АДНЭЙ ДУМКІ АБ ПЛУГОХ

„Плугі „Сухэні" № 0—няўстойлівыя"

Учора рэдакцыя нашае газэты запампаравала ў прыгародныя вёскі Лошыца і Сяміжонкі свайго супрацоўніка з спэцыяльным заданьнем:

Выявіць адносіны сялян да плугоў, якія выраблены на беларускіх заводах, у прыватнасьці да сыстэмы «Сухэні» № 0, аб залежах якіх на станцыях МБВ чыг. і інш. сваячэсова паведамлялася ў нашай газэце.

Наш супрацоўнік пабываў у хатах заможных сялян, сярэднякоў і беднякоў. Вось што паведалі сяляне:

Для звычайнай сярэдняцкай гаспадаркі, для слабога вясковага каня лёгкі плуг—найлепшы. Сыстэма «Сухэні» № 0—1, як быццам, прыстасавана для аднаконнай гаспадаркі.

«Але вось бяда,—кажа бядняк-селянін в. Сяміжонкі Архіп Бучала,—плугі сыстэмы «Сухэні», якія вырабляюцца на беларускіх заводах, вельмі няўстойлівыя. Прыходзіцца непарыўна трымаць плуг, моцна нажымаць, бо ён імкнецца ў «небеса».

«Мы прывыклі,—гаворыць далей Бучала,—да моцнага саматужнага плуга, а ў заводзкім—і жалеза чамусь-ці мяккае, і псуецца ён хутка, і паасобныя часткі слаба прымацаваны. Заводзкі плуг можа паслужыць год—два, а саматужны—3 і нават 4».

Селянін Жукоўскі з Лошыцы лічыць за лепшае зьвяртацца да мясцовага каваля. Апошні з свайго матар'ялу зробіць за 9—10 рублёў добры плуг, ён прымае і заказы на плугі з матар'ялу заказчыка. Што з таго, што мы купілі плуг у «сындыкаце», калі прыходзіцца перарабляць яго ў каваля? Там плаці 10—11 рублёў і кавалю за пераапрацоўку—3 рублі—вось табе і ўсе 13 рублёў. Дышаль ў «сындыкацкім» плугу дрэнна пастаўлены, накладня (палявая дошка) кульгае.

Заможны селянін Пасядоўскі якасьцю плугоў здаволен, праўда, ён купляе ня «0», а двухконныя, вышэйшыя нумары.

Цікава, што Пасядоўскі ведае пра «плужныя залежы» на чыгунцы. Ён па-свойму хітры: не бяда,—заяўляе Пасядоўскі,—што плугі гадамі ляжаць пад сьнегам, яны не заржавеюць...

Такім чынам, сялянства, якое карыстаецца плугамі сыстэмы «Сухэні», пэўна нездаволена некаторай неадпаведнасьцю частак гэтае сыстэмы, дзякуючы чаму яны, плугі, якія куплены ў «сындыкаце», аддаюць у перапрацоўку мясцовым кавалём.

Анэкдатычнае ў трагічным

Праўленьне Белсельсаюзу мусіць у вельмі добрым настроі. «Изволят, даже шутить».

Сёньня гэтае самае праўленьне прыслала нам адказ, дзе піша:

«На пытаньне Эканомпрады, чаму да часу ліквідацыі Белпагрузу Белсельсаюз ня прыняў належных мер да пабудовы або закупкі складаў для захаваньня плугоў, праўленьне Белсельсаюзу адказвае: праўленьне Белсельсаюзу ў хуткім часе пасьля прыёму тавараў і маемасьці Белсельсаюзу ад старога праўленьня склала праект і каштарыс на пабудову навесу на двары Белсельсаюзу, і праект гэты быў перададны Камгасу для вырашэньня. Калі-б ня было забароны з боку Камгасу на пабудову навесу, дык апошні напэўна стаяў-бы ўжо на месцы і там ляжалі-б плугі».

Сапраўды, ці можна знайсьці лепшага гаспадара, як Белсельсаюз! Падумайце толькі,—Белсельсаюз хацеў пабудаваць навес ні дзе-небудзь пад горадам ці на акраіне, а абавязкова на сваім уласным двары. Вось дык прыкладны гаспадар, які шануе сваю маемасьць!

Гэты адказ Белсельсаюзу ніяк толькі ня ўвязваецца з тымі тысячамі плугоў, якія ўжо некалькі год валяюцца на вуліцы недзе каля чыгункі без належнага нагляду. Так што, паважаныя таварышы з Белсельсаюзу, вы ўжо вашу гарачую зацікаўленасьць пакіньце пры сабе. Нам зусім зразумела, чаму Камгас забараніў будаваць навес на вашым дварэ, дзе і так цесна і дзе гэтага нельга рабіць па мяркаваньнях пажарнае аховы.

Між іншым, другі пункт адказу Белсельсаюзу зьяўляецца яшчэ лепшым анэкдотам. Праўленьне піша:

«На пытаньне, «што рабіў-бы Белсельсаюз тады, калі-б ня было ліквідацыі Белпагрузу і продажу яго пакгаузаў», даем такі адказ: «калі-б у той час, як мы атрымалі эдмову Камгасу на пабудову навесу, ня стала відома аб ліквідацыі Белпагрузу, дык мы паставілі-б перад сабою пытаньне аб тэрміновай пабудове ўласнага складу».

Тут сам чорт не разьбярэ гэтую сафістыку Белсельсаюзу. Замест таго, каб ясна і канкрэтна адказаць і прызнаць, што пры старым ці пры новым праўленьні Белсельсаюзу ніхто ня цікавіўся захоўваньнем плугоў, новае праўленьне Белсельсаюзу працягвае наводзіць туман на гэтае пытаньне і спрачацца з Эканомпарадай. Усё «калі-б ды калі-б». «Калі-б ды кабы, дык расьлі-б у роце грыбы». У сапраўднасьці-ж, Белсельсаюз толькі і займаўся тым, што пытаньні «ставіў там, ставіў тут», а на пытаньнях гэтых так склад і ня вырас і не пабудаваўся.

Гэткі анэкдатычны адказ Белсельсаюзу ў другі раз і наконт другое справы можна было-б лічыць добрым анэкдотам, калі-б гутарка ня ішла аб вельмі і вельмі сур'ёзнай справе, калі-б яны ня сьведчылі аб злачынай нядбайнасьці і страшэнным бюракратызьме ў адной з важнейшых грамадзкіх устаноў—у Белсельсаюзе.

Адказ Белсельсаю у мае яшчэ і добры бок таму, што ён часткова высьвятляе заблытаную справу з плугамі. У ім гаворыцца:

«Прычына затаварваньня плугоў,—і гэта ёсьць галоўная прычына,—у тым, што цана на іх надта высокая, дзякуючы чаму саматужнікі ствэрылі канкурэнцыю, прадаючы свой плуг на паўтара-два рублі таней прамысловага, тым больш, што плуг саматужнага вырабу па якасьці ня горш прамысловага. Лічым неабходным падкрэсьліць, што плугі Белдзяржмэтрыому не прадстаўляюць сабою правільна пабудаваных і падабраных канструкцый».

Такім чынам, Белсельсаюз урэшце прызнае, што цана на плугі вельмі дарагая і што, самае галоўнае, плугі прамысловага вырабу не прадстаўляюць сабою правільна пабудаваных і падабраных канструкцый, інакш кажучы,—няпрыгодны для беларускага сялянства. Падкрэсьліваем, што гэты вывад робіць сам Белсельсаюз. А калі так, дык чаму вы, белсельсаюзаўцы, прынялі і заказвалі няпрыгодныя плугі? Адказвайце, паважаныя!

Л.

Пазыка ўзмацненьня сялянскае гаспадаркі

НА КОЖНЫ ДВОР—АБЛІГАЦЫЮ

Асноўныя моманты агіткампаніі

Дзяржава з году ў год па бюджэце выдае ўсё большыя і большыя сумы на ўзмацненьне сельскае гаспадаркі. Толькі па аднэй БССР у 1925-26 годзе было выдана 98.865 р.; у 1926-27 г.—107.385 і на 1927-28 год намечана 120.930 р. Апрача таго па лініі сельска-гаспадарчага крэдыту адпушчана сялянству ссуды: у 1925-26 г.—5.339.700 р.; у 1926-27 г.—9.300.000 р. і ў 1927-28 г. наменена да водпуску 17.180.000 р. Ня гледзячы на рост сродкаў, якія выдаюцца на патрэбы сельскае гаспадаркі бюджэтнымі і крэдытнымі органамі, усё-ж іх не хапае для таго, каб пераабсталяваць адсталую сельску гаспадарку,—выжыць працэнт саху і смык і замяніць іх сельска-гаспадарчай машынай.

Пры сучасным эканамічным становішчы наша дзяржава ня можа кінуць такую суму сродкаў, якая-б поўнасьцю здаволіла патрэбы сельскае гаспадаркі,—вось чаму ўрад СССР настанавіў выпусьціць дзяржаўную ўнутраную выйгрышную пазыку ўзмацненьня сельскае гаспадаркі на 100.000.000 руб., якія павінны быць рэалізаваны ў вёсцы ў бліжэйшыя 2-3 месяцы.

Эканамічныя ўмовы вёскі ў даны час спрыяюць разьмеркаваньню гэтае пазыкі: невялікі сельска-гаспадарчы падатак, пашырэньне лесагасрацовак і іншых заработкаў і г. д.

Поспех рэалізацыі пазыкі ў значнай меры будзе залежаць ад таго, як тэрмова партыйныя, камсамольскія і іншыя арганізацыі змогуць разгарнуць гэту кампанію, як поўна будзе азнаёмлена сялянства з выгадамі гэтае пазыкі,—таму партыйчэйкі, савецкія органы, палітасьветы і іншыя грамадзкія арганізацыі павінны зараз-жа пачаць шырокую агітацыйна-масавую работу па растлумачэньні карысьці і пераваг пазыкі. Работа хат чытэльняў, нарадамоў і чырвоных куткоў павінна быць падпарадкавана гэтай кампаніі. Неабходна ставіць даклады, правозіць гутаркі аб выгаднасьці пазыкі, дапасаваць адпаведную п'есу, кіна-фільму і гэтак далей.

Апрача работы ў культустановах, трэба выкарыстаць для растлумачальнай работы сялянскія сходы, вечарыны і г. д. Ужо зараз трэба пусьціць падпісныя лісты з тым, каб да моманту атрыманьня аблігацый ужо мець сьпісы падпісчыкаў.

Члены партыі і камсамольцы павінны быць прыкладам для ўсяе сялянскае масы. Усе яны першымі падпісваюцца на пазыку. Гэтым, аднак, ня вычэрпваюцца задачы ячэек — яны павінны праводзіць глыбокую штодзённую агітацыйную работу за падпіску на пазыку сярод сялянства.

Насьцежаззэты займаюць у гэтай кампаніі вялізнае месца. Неабходна, каб яны найбольш поўна абслугоўвалі кампанію разьмеркаваньня пазыкі, асьвятлялі ход падпіскі, зьмяшчалі фатаграфічныя здымкі паасобных сялян, якія падпісаліся на вялікую суму.

На падставе выкананьня дырэктыў XV-га зьезду УсеКП(б) аб уцягненьні дробных зьбіраньняў у асяродзішча дзяржрэдыту павінна праходзіць кампанія разьмеркаваньня пазыкі.

Асноўным яе лёзунгам павінна быць: **ніводнага селяніна, які-б не падпісаўся на пазыку.**

П. Тамашэўскі.

650 тысяч руб. павінна даць

Бабруйская акруга

Бабруйск. (Уласн. кар.). Падрыхтоўка да рэалізацыі пазыкі шырока разгорнута па ўсёй акрузе. Арганізавана акруговая камісія па дапамозе распаўсюджаньню пазыкі.

Акруговай камісіяй распрацаваны мерапрыемствы па растлумачэньні сярод насельніцтва ўмоў падпіскі, а таксама значэньня пазыкі.

У кампаніі прымаюць шырокі ўдзел партыйныя ячэйкі, райкомы, а таксама і савецкія арганізацыі.

У сучасны момант райвыканкомы на мясцох ужо прыступілі да арганізацыі агентурнай сеткі.

Па ўсёй акрузе мяркуецца распаўсюдзіць аблігацый пазыкі на 650 тыс. руб.

У працы па распаўсюджаньні прымуць удзел каапэрацыя, каса ашчаднасьці, сельсаветы і лістаносцы.

Квітанцыі, якія выдаюцца замест аблігацый, ужо атрыманы і разьмеркаваны па раёнах. М.

Попыт на аблігацыі

Ворша. (Уласны кар.). Яшчэ да атрыманьня часовых пасьведчаньняў на сялянскую пазыку на мясцох выявіўся попыт на аблігацыі.

Раённы сход уповноважаных сельска-гаспадарчых крэдытных таварыстваў Лядзянскага раёну пастанавіў:

— Кожнаму ўпоўнаважанаму падпісацца на аблігацыю шырока папулярызаваць пазыку.

Весткі аб жаданьні падпісацца на пазыку паступаюць і з іншых раёнаў акругі.

ТЭМП ЗАГАТОВАК ПА БССР УЗМАЦНІЎСЯ

БОЛЬШАСЬЦЬ ЗАВОЗІМЫХ ПРАМТАВАРАЎ НАКІРОЎВАЕЦЦА Ў ВЁСКУ

НЕАБХОДНА УЗМАЦНІЦЬ УВАГУ МЯСАЗАГАТОЎКАМ

Прамтавары ў вёску

Уся прадукцыя Дубровенскай фабрыкі—вёсцы

(Гутарка з нам. Наркамгандлю БССР тав. БРЫСКІНЫМ)

Наркамгандлем удзяляецца ў сучасны момант галоўная ўвага на забясьпечаньне вёскі прамысловымі таварамі. Калі раней да сялянства ішло 50 проц. выпускаемай прадукцыі, дык цяпер 75—80 проц. таварнай масы прамысловых тавараў накіроўваецца на вёску. Плян забясьпечаньня дэфіцытныхі тавараміна другі квартал пабудаваны з такім разрахункам, каб вёска атрымала ў сярэднім ня менш 75 проц. па скураных таварах, 90 проц. па жалезе і 100 проц. па ваконным шкле і інш.

Паміма гэтага, Наркамгандлем прадпрыняты цэлы рад мерапрыемстваў для пашырэньня номэнклятуры тавараў, якія накіроўваюцца на вёску. Мэбля, швэйныя машыны, абутак, шорныя вырабы—усё гэта тавары, якія раней селянін мог атрымаць толькі ў горадзе, цяпер пасунуты ў вёску, і праз сельска-гаспадарчую каапэрацыю будуць разьмеркаваны непасрэдна ў вёсцы.

Асобныя тавары, як жалеза для дахаў, аконнае шкло і іншыя тавары, на якія сялянства прадчуляе вялікі попыт, будуць на другі квартал накіраваны ў вёску на ўсе 100 проц. Наркамгандаль адпусьціў Белхарчтрэсту дадаткова да адпушчаных для вёскі 15-ці цыстэрнаў ільнянога масла яшчэ 10 цыстэрнаў на другі квартал. Акрамя таго, уся прадукцыя Дубровенскай мануфактурнай фабрыкі, якая раней ішла на забясьпечаньне гораду, цяпер будзе выключна ісьці ў вёску, у асаблівасьці да забясьпечаньня мануфактурай хлебазагатоўчыя раёны.

Наркамгандаль прыняў цэлы рад мер да ўзмацненьня забясьпечаньня прамысловымі таварамі загатоўчыя раёны. З назначаных цэнтрам 5-ці вагонаў бавоўняна-лазаровых тканін, адпушчаных для гораду, два вагоны перададны для забясьпечаньня вёсак загатоўчых раёнаў. Акрамя гэтага з адпушчаных для гораду на 100 000 руб. суконня-шарсьцяных тавараў палова гэтых тавараў на 50.000 руб. будзе накіравана ў вёску. Для хутчэйшага забясьпечаньня загатоўчых раёнаў с.-г. машынамі. Наркамгандлем пераразьмеркаваны водпуск машын, і 75 проц. с.-г. машын, раней выданых Цэнтраземскладу, перадаюцца с.-г. каапэратывам для непасрэднага забясьпечаньня сялянства.

Чаму тармазяцца мясазагатоўкі

(Гутарка з інспэктарам Наркамгандлю БССР тав. СКАКОЎСКІМ)

БЯСПЛЯНАВАСЬЦЬ І БЕЗАДКАЗНАСЬЦЬ.

Мясазагатоўкі ў БССР у першым квартале разьвіваліся невыстарчальна інтэнсыўна. Белмясгандаль за першы квартал выканаў заданьне толькі на 62 проц., загатовіўшы 1.438 тон мяса. Хоць мы яшчэ ня маем поўных вестак аб колькасьці загатоўкі мяса Белкаапсаюзам і Белсельсаюзам, але маючыяся частковыя весткі гавораць аб значным недавыкананьні заданьня.

Асноўнаю прычынаю такога нездавальняючага разьвіцьця мясазагатовак трэба лічыць, з аднаго боку, адсутнасьць у нізавой сеткі ўказаньняў і заданьняў з боку каапэрацыйных цэнтраў 3 другога боку, гэтыя самыя каапэрацыйныя цэнтры (Белсельсаюз і Белкаапсаюз) не арганізуюць сыстэматычнага збыту тых мясных прадуктаў, якія загатаўляюцца нізоўкай. Зразумела ў многіх выпадках частка віны падае таксама і на нізавыя каапэрацыйныя арганізацыі.

У Гомельскай акрузе пры спрыяючых умовах мы маем такое ненармальнае зьявішча, што там працуе па мясазагатоўках усяго толькі адно сельска-гаспадарчае т-ва і 2—3 спажывецкія т-вы.

Нізавыя каапэрацыйныя органы часта вядуць мясазагатоўкі па ўласнай ініцыятыве без усялякага пляну, у выніку чаго мы маем дэзарганізаваны мясны рынак.

Мала таго, многія каапэрацыйныя органы вядуць мясазагатоўку пераважна цераз прыватніка-гандляра, які пад фірмай каапэрацыі абрабляе свае цёмныя справы і ўзьвінчывае цэны на рынку.

Нізоўка збывае загатоўленыя мясныя прадукты не ў адпаведнасьці з устаноўленым плянам, а па сваім усматрэньні, выходзячы толькі з інтарэсаў камэрцыйнай выгады. Так, Гарэцкае сельска-гаспадарчае таварыства (Аршанская акруга), маючы загатоўленую жывёлу, адмовілася пакіраваць адзін вагон жывёлы ў г. Оршу (дзе ў тыя часы адчувалася вострая патрэба ў мясе) і адправіла мяса ў Вязьму, за межы БССР.

Яшчэ адна яскравая ілюстрацыя: Цімкавіцкае сельска-гаспадарчае т-ва, загатовіўшы звыш 1 т. пудоў мяса, ня ведала, што рабіць з гэтым мясам, куды яго накіраваць, ня маючы ніякіх указаньняў ад свайго каапэрацыйнага цэнтру.

З тых мерапрыемстваў, якія прыняў Наркамгандаль для зьнішчэньня ўсіх гэтых ненармальнасьцяй можна адзначыць наступнае: на кіраўнікоў мясазагатоўчых арганізацый ускладзена пэрсанальная адказнасьць за поўнае выкананьне плянаў, як па загатоўцы, так і па забясьпячэньні мясам гарадоў.

Нягодны загатоўчы апарат

Пад суд каапэратарау-спэкулянтаў

ВОРША. (Уласны кар.). Акркамунгандалем разам з адпаведнымі ўстановамі прыняты меры барацьбы з спэкуляцыяй, узьвінчваньнем цэн і продажам прыватным гандляром збожжа.

Так, напрыклад, за продаж шпанічнай мукі прыватнаму гандляру зьнят з працы ўвесь штат магазыну аршанскага ЦРК № 9.

Загадчык гэтага магазыну Шур аддаецца пад суд.

Таксама за продаж мукі прыватнікам аддаецца пад суд праўленьне Расьнянскага спажывецкага таварыства, Дубровенскага раёну.

На нар дзе хлебазагатоўшчыку, якая адбылася пры Аршанскім Акркамунгандлі, выявілася шмат фактаў скрыўленьня палітыкі хлебазагатовак.

Так, заг. шкловскім аддзяленьнем Белдзяржгандлю, не разумеючы нават сваіх функцый, піша ў дакладным лісьце на адрас акруговага аддзяленьня, што праца па загатоўках ідзе слаба таму, што арыштаваны тыя, якія дастаўлялі тавар—спэкулянты. Такім чынам ён выдаў свой сакрэт, што загатоўкі ён робіць праз спэкулянтаў. Эр.

Пэрспэктывы экспартных загатовак прадукцыі рыбаводзтва і разьвядзеньня трусоў

У сучасны момант з усіх вадзёмаў БССР вылаўляецца каля 75.000 цэнтнэраў рыбы ў год, ў тым ліку 40.000 цэнтнэраў для продажу. У склад прадаваемай рыбы ўваходзіць каля 12.000 цэнтнэраў першага сорту (вагой 400 і больш грам штука).

Акрамя рыбы ў вадзёмах БССР вылаўляецца ў год каля 500.000 шт. ракаў.

У гэтым годзе можна будзе адправіць за граніцу 8.000 цэнтнэраў дзікай рыбы, 2.000 цэнтнэраў карпа і каля 600.000 шт. ракаў.

Пры рацыяналізацыі рыбнай гаспадаркі колькасьць вылаўляемай рыбы ў натуральных вадзёмах можна будзе павялічыць да 150.000 цэнтнэраў у год, у тым ліку 60.000 цэнтнэраў першага сорту.

Для сажалак будуць выкарыстаны нізінныя і пераходныя балоты, якія ня маюць амаль што ніякай значнасьці ў сельскай гаспадарцы.

Ёсьць мажлівасьць адпраўляць рыбу і ракаў у Польшчу і Нямеччыну, пры чым польскі рынак зможа прыняць штогодна 80.000 цэнтнэраў рыбы, нямецкі рынак—каля 500.000 цэнтнэраў рыбы і 10 мільёнаў шт. ракаў.

У 1927 г. былі адпраўлены ў Польшчу 2 вагоны рыбы — галіцыйскага, люстэркавага карпа і некалькі дробных партый дзікай рыбы, а ў Нямеччыну каля 500.000 шт. ракаў. У тэхнічных адносінах гэтыя апэрацыі далі добрыя вынікі. Што датычыць камэрцыйных разхункаў, дык найбольш выгоднымі аказаліся апэрацыі і на экспарце карпа.

У беларускай гаспадарцы разьвядзеньне трусоў можа мець добрыя пэрспэктывы. Невымагальны зьвярок-трус прыносіць карысьць чалавеку—мясам, тлушчам, скурою, пухам і клеем з адкідаў касьцей, лапак, вушэй.

Разьвядзеньне трусоў набыло асаблівую значнасьць цяпер, калі выявіўся попыт на скуркі трусоў і нават на трусіны гной, які прадстаўляе добрае ўгнаеньне для садоў і агародаў.

На Беларусі разьвядзеньне трусоў разгарнулася толькі ў ваенны пэрыяд, калі многія жыхары гораца, а часткова і вёскі разводзілі па 50—100 трусоў для прахарчаваньня сваёй сям'і.

Базай для прамысловага разьвядзеньня трусоў у БССР павінны быць рассадзікі каапэрацыйных таварыстваў вакол вялікіх гарадоў.

ХТО КАГО?

Канкурэнцыя паміж каапэрацыяй і прыватнікамі ў Меншчыне

Каапэратывы пачынаюць выбіваць прыватных перакупшчыкаў, якія канкуравалі з спажывецкімі таварыствамі і тармазілі загатоўкі.

З Сьмілавіцкага спажывецкага таварыства паведамляюць, што прыватнікі ўзьвінчвалі цэны на збожжавыя прадукты: каапэратыў плаціў за збожжа на 1 руб. 25 кап., а прыватнікі на 1 руб. 60 кап.—1 руб. 70 кап. Прыняты адпаведныя крокі, і прыватнікі пакідаюць сваё поле дзейнасьці.

З Смалявіцкага спажывецкага таварыства паведамляюць, што сырцовыя загатоўкі ідуць звыш чаканьня, ужо загатавана сырцовых прадуктаў на 3.000 рублёў, па скурсырцу заданьне было дана ў суме 500 рублёў, ужо загатавана на 300 рублёў. Загатавана 600 пудоў аўсу, 200 пудоў ячменю і 400 пудоў пшаніцы. Палявых узносаў сабрана каля 400 рублёў. Прыватнікі ўсё яшчэ канкуруюць.

З Дукорскага спажывецкага таварыства, Сьмілавіцкага раёну, паведамляюць, што выкананьне заданьня ідзе здавальняюча. Прыватнікі канкуруюць. З Чэрвеня прыяжджаюць перакупшчыкі і ўзьвінчваюць цэны. Прыняты адпаведныя меры.

З Грэбенскага спажывецкага таварыства, Чэрвенскага раёну, паведамляюць, што хлебныя і сырцовыя загатоўкі ідуць здавальняюча. З Сьмілавіч прыяжджаюць прыватнікі і ўзьвінчваюць цэны на пушніну. Прыватнікі робяць загатоўку куніц тады, як законам гэта забараняецца. Чэрвенская сельска-гаспадарчая каапэрацыя не захоўвае лімітных цэн.

З Койданаўскага спажыв. таварыства паведамляюць, што сырцовая і хлебныя загатоўкі ідуць у поўнай меры здавальняюча. Да гэтага часу прыватнікі канкуравалі з спажыв. таварыствам, цяпер прыняты адпаведныя меры, прыватнікі адыходзяць ад рынку і загатаваны імі хлеб прапанаваны каапэратыву па дзяржаўных цэнах: 2 вагоны ячменю і жыта і адзін вагон ільнянога семя.

З Марына-Горскага спажыв. таварыства, Пухавіцкага раёну, паведамляюць, што збожжавыя загатоўкі ідуць туга, з прычыны адсутнасьці кармавых прадуктаў (высяўкі і макуха) для забясьпечаньня сялянскага насельніцтва і для абмену на збожжавыя прадукты. Загатаваны прыватнікам 200 пуд. ячменю і 200 п. жыта праданы каапэратыву нізкай дзяржаўных цэн.

З Сінчанскага спажыв. таварыства, Пухавіцкага раёну, паведамляюць, што збожжавыя загатоўкі ідуць здавальняюча. Збожжавых прадуктаў ужо загатавана каля 100 пуд. Сырцовых прадуктаў загатавана на 200 руб.

З Качынскага спаж. т-ва, Заслаўскага раёну, паведамляюць, што загатоўкі ідуць слаба. Пакуль што загатавана 500 пуд. збожжавых прадуктаў. Перашкаджае тое, што менскія прыватнікі ўзьвінчваюць цэны, бо спажыв. таварыства знаходзіцца на адлегласьці 12 верст ад Менску. Ваўкавіцкі.

Калектыўныя дагаворы

Аб нашым дагаворы

(Фабрыка акуляраў, Віцебск)

На працягу цэлага месяца цягнуліся перагаворы паміж прафсаюзам мэталістых і адміністрацыяй фабрыкі акуляраў.

Праўленьне саюзу на падставе праканоў рабочых высунула рад новых пунктаў:

Выдаць узмоцненую выхадную даканому пры скарачэньні рабочых у выпадку рацыяналізацыі незалежна ад колькасьці скарачэньня, пашырыць колькасьць рабочых, якія атрымліваюць спэцвопратку, у выпадку перакідкі рабочых на новую працу аплачваць ім першыя два тыдні па сярэднім заработку і другія два тыдні ня ніжэй тары ай стаўкі рабочага данай спэцыяльнасьці.

На граекце новага калдагавору гаспадарнік ня мае права сам перагаварваць расцэнкі, а толькі з згоды РКК, чаго раней ня было.

Праект новага дагавору паляпшаў таксама і добрабыт нашых работніц. Адміністрацыя не згадзілася з асноўнымі запатрабаваньнямі калдагавору. Умяшаньне прадстаўніка беларускага камітэту мэталістых не дало належных вынікаў. Прышлося зьвярнуцца ў арбітраж. Трацейскі суд, які нядаўна адбыўся, вырашыў усе спрэчныя пытаньні. Ханін.

Павялічэньне зарплаты

СЛУЦАК. Часткова заключаны дагаворы па саюзах камунальнікаў, шархарч, харчавікоў. Поўнасьцю скончана праца па саюзе гарбароў.

Дасягнута павышэньне зарплаты адсталым групам рабочых і служачых: па прачачных—на 8 проц., па лазьні—на 5 проц., па пякарні—на 4 проц.

Рабочыя нічога ня ведаюць

(Шпалерная фабрыка, Менск)

Нядаўна старшыня цэнтральнага праўленьня саюзу друкароў тав. Сянчук два разы інфармаваў рабочых аб ходзе перагавораў з адміністрацыяй наконт новага калдагавору.

Рабочыя дазволілі тав. Сянчуку падпісаць тарыфную частку дагавору. Наконт прававой часткі тав. Сянчук заявіў, што адміністрацыя імкнецца зьнізіць чарговы водпуск з аднаго месяца да двух тыдняў, а у некаторых аддзяленьнях фабрыкі адабраць у падручных рабочых спэцабутак, пагоршыць забясьпячэньне рабочых спэцвопраткай. Рабочыя не згадзіліся ні з адным з пунктаў прапаноў адміністрацыі і далі саюзу наказ: у новым калдагаворы павінен быць захаваны месячны водпуск, галёшы, якія выдаваліся па старым дагаворы падручным павінны быць заменены ботамі, спэцвопратку трэба выдаваць два разы ў год; рабочых неабходна прымаць выключна праз біржу працы. Калдагавор падпісан, але рабочыя да гэтай пары ня ведаюць, ці выканан іх наказ, бо дакладу саюзу аб выніках перагавораў да гэтай пары ня было.

Рабочы.

УСЕ ВЫЙГРАЛІ

Кожнае лета, калі выгарала чацьвертая частка валасьці, мужыкі ў нядзелю зьбіраліся на прызьбе і пачыналіся гуткаркі.

— Два дні таму назад у Завіхлеўцы зноў пяць гаспадароў пагарэлі,—пачынаў хто-небудзь.

— За грахі нашы,—хрысьціліся старыя.

— За грахі, не за грахі,—устаўляў хто-небудзь малодзейшы,—а пажарную машыну таксама ня грэх-бы прывезьці.

— Ня грэх,—ахвотна згаджаліся мужыкі.

— А вось, браткі,—пачынаў стары чырвонаармеец Філін,—у горадзе пажарныя машыны. На аўтамабілях разьяжджаюць, пажарныя ў чырвоных шапках, паравая машына і які пажар можа адразу патушыць.

— Вось-бы нам хоць адну машыну з меднымі шапкамі,—уздыхаў нехта.

— Бач, ты чаго захацеў, нам бы бочку грамадзкую набыць... Ды помпу.

— Дык у чым-жа справа?—умяшаўся камсамолец Рыгор,—давайце купім.

— Купім,—злавалися мужыкі,—а «пакупалка» ў цябе ёсьць? За што ты купіш?

— Зьбяром грошы і купім,—хваляваўся Рыгор,—і гарэць ня будзем.

— Зьбяром. Яно, зразумела, можна.

— Ну, і давайце зьбярэмся, абмазгуем,—прапанаваў Рыгор.

— Ну, дык што-ж зьбярэмся.

Але сабрацца ніяк не маглі. У будні дзень не зьбярэшся—лета—час гарачы, а сьвятам—адпачыць хочацца,—не катаржныя-ж мы па сходах бегаць. Так і гарэлі да восені. А там надышла зіма, ніхто не гарэў, а калі не гарэў, дык і машына непатрэбна, дарма толькі грошы траціць.

А летам зноў пажары, гутаркі на прызьбе і абяцанкі сабрацца і абмеркаваць.

Тыдзень таму назад на агульным сходзе прыяжджы дакладчык зрабіў даклад аб повай сялянскай пазыцы. Ён гаварыў аб дапамозе дзяржаве, аб процантах, аб выігрышах, аб дапамозе самім сабе. Мужыкі выслухалі даклад уважліва.

За дакладчыкам выступіў камсамолец Рыгор. Ён таксама гаварыў пра пазыку, пра сьвядомасьць грамадзян-сялян і пра пажарную машыну. Грамадзяне-сяляне выслухалі і пра пазыкі і пра сьвядомасьць, а як дайшла справа да машыны, пачалі гудзець:

— Хто пра што, а дурань пра кашу.

— Чаго тушыць, калі не гарыць.

— Садзіся, нагаварыліся Аб справе кажы,

Рыгор махнуў рукою і сеў, а мужыкі тут-жа пачалі ў старшыні сходу падпісвацца на пазыку.

Толькі дзед Фядот крычаў, што не падпішацца: навошта яму грошы выйгрываць, калі яму малатарня патрэбна. Чхаць яму на грошы. Пасьля таго, як прыяжджы дакладчык растлумачыў Фядоту, што замест выйграных грешай ён можа атрымаць любую машыну, Фядот здаўся і пашоў да старшыні:

— Пішы і мяне на гэту, як яе...

— А два з паловаю зараз уняесіш ці пасьля?

— Якія два з паловаю?—разгаляваўся Фядот,—ты слухай, што табе кажуць. Атрымай пяцёрку, буду чакаць малатарні, а інакш не хачу.

У адну веснавую нядзелю сядзелі мужыкі на прызьбе і ўважліва чыталі газэту з абвесткай аб выйгрышах. Тут-жа з хітраватай усьмешкай вярцеўся і Рыгор.

— Чуць-чуць ня мой нумар.

— Толькі двух лічбаў не хапае.

— А ты лепш паглядзі.

— Браткі, дальбог, Васіля Канцавога нумар. Васіль, ідзі, 100 р. выйграў

— І шанцуе-ж людзям.

— А больш нікому выйгрышаў няма?

— Няма, усе іншыя прайгралі.

— Маніш, усе выйгралі,—умяшаўся адразу Рыгор.

— Гэта-ж як?

— А вось як,—сьмяяўся Рыгор,—глянце.

Мужыкі глянулі. З пригорку спускалася дзіўная працэсія: папе-радзе камсамолец Васіль на кані, са сьцягам у дзіўнай бліскучай шапцы на галаве, за ім нейкая дзіўная зялёная машына, а за машынаю тры зялёныя бочкі.

— Вось,—урачыста паказаў Рыгор,—выйгрыш.

— Што ты брэшаш?—разгаляваліся мужыкі,—дакладчык пра гэта нічога не казаў і ў газэтах няма.

— Казаў,—засьмяяўся Рыгор,—толькі вы ня тым месцам слухалі. Пра пазыку гаварыў дакладчык.

— Ну—гаварыў.

— А пра адлічэньні ў валасьць 10 проц. з праданых аблігацый гаварыў?

— Быццам і гаварыў.

— Ну, значыцца, добра падпісалася наша валасьць на пазыку,—10 проц. у нашу карысьць. Вось на гэтыя грошы і купіў волвыканком пажарную машыну.

— Та-ак,—пачухалі мужыкі патыліцы,—нечаканка якая...

— Значыцца, выйгралі?

— Быццам і выйгралі.

— Усе?—не адставаў Рыгор.

Мужыкі глянулі адзін на аднаго.

— Т-так, як быццам і ўсе.

МІЛЬЁН ПУД. ХЛЕБНЫХ ПРАДУКТАЎ НА САМАГОН

(Гутарка з членам калегіі НКЮ і памоцнікам пракурора рэспублікі па агульным наглядзе тав. СУДАКОВЫМ)

Барацьба з самагонакурэньнем ва ўмовах Беларусі значна страшэйшая, чым у іншых рэспубліках Саюзу. Гэта выяўляецца ня толькі ў агульнай карнай палітыцы, але і ў заканадаўстве—крымінальным кодэксе і строгіх адміністрацыйных мерах.

У судох праходзяць справы выключна рэцыдывістых-самагоншчыкаў ці асоб, якія займаюцца самагонакурэньнем у выглядзе промыслу.

Палітыка НКЮ Беларусі па барацьбе з самагонакурэньнем была дагэтуль накірована ў бок выяўленьня самагоншчыкаў і павялічэньня мер кары.

У 1926 годзе праз суды прайшла 991 справа самагоншчыкаў-рэцыдывістых, а за 11 месяцаў 1927 году—953 справы. За першае паўгодзьдзе 1926 году было асуджана да пазбаўленьня волі па розных тэрміны 234 чалавекі, а за гэты-ж час 1927 году—262. Акрамя таго, да іншых мер кары было асуджана за першую палову 1926 году 148 чалавек і за гэты-ж час 1927 г.—135 чал. Трэба адзначыць, што ў суды пападае самая мінімальная колькасьць спраў і яна роўна 0,25 проц. з агульнай колькасьці адміністрацыйных спраў.

Па прыблізных падліках, улічваючы справы суловага і асабліва адміністрацыйнага характару, па ўсёй Беларусі трацілася штогодна на выгонку самагону каля мільёну пудоў збожжа, бульбы, ячменю і інш.

Калі падлічыць страту аднаго толькі збожжа, то яно будзе роўна прыблізна 300.000 пудом.

Адсюль ужо выцякае тая вялікая шкода, якую прыносяць дзяржаве самагоншчыкі.

Чым выклікана такое разьвіцьцё самагонакурэньня, ня гледзячы на гандаль хлебным віном?

Самагоншчыкі з пуда хлеба, які па загатоўчай цане каштуе 1 р. 80 к., выганяюць да 16 бутэлек самагону з моцай, роўнай моцы хлебнага віна. Прадаецца-ж бутэлька самагону па 40-60 к. Акрамя таго, карыстоўваецца для жывёлы пакінутая брага.

Наркамюст у апошні час прыняў рад практычных мерапрыемстваў па барацьбе з самагонакурэньнем.

У СНК прадстаўлен праект закону, згодна якога ўзмацняецца карная санкцыя супроць самагоншчыкаў, асабліва ў судовым парадку. Узмацняюцца рэпрэсіі за вырab і захаваньне самагонных апаратаў і пашыраецца падсуднасьць спраў, якія раней разглядаліся ў адміністрацыйным парадку.

Адначасова НКЮ даў дырэктывы судом і пракурорам аб узмацненьні карных санкцый супроць самагоншчыкаў па дзейным заканадаўстве.

Пракурорам паказана на неабходнасьць уваходзіць у суд з прапановамі аб высылцы самагоншчыкаў з межаў іх месцажыхарства незалежна ад адданьня іх суду.

Устаноўлены тэрміны для разгляду спраў у судох, у органах сьледзтва і дазнаньня. Суд абавязан разглядзець самагонную справу ў 5 дзён. Органы сьледзтва і дазнаньня павінны заканчваць гэтыя справы ў тры дні з моманту іх паступленьня.

Пракурорам таксама запрапанавана ўзбудзіць крымінальнае праследваньне супроць сельсаветчыкаў і інш. органаў за нядбайнасьць і бязьдзейнасьць па 107 і 108 артыкулах крымінальнага кодэксу.

М. К-н.

Культурныя навіны

Адказнасьць за непасылку дзяцей у школы

НК Унутраных Спраў разам з Наркамасьветы і Юстыцыі выдалі абежнік па пытаньні аб адказнасьці за непасылку дзяцей у школы ў мясцовасьцях, дзе ўведзена ўсеагульнае абавязковае навучаньне.

Гэтым абежнікам прапануецца ўсім акрвыканкомам пры выданьні імі абавязковых пастановаў аб увядзеньні ў тэй ці іншай мясцовасьці ўсеагульнага абавязковага навучаньня ўстанаўляць у гэтых пытаньнях адказнасьць за непасылку дзяцей для навучаньня ў 1-ы канцэнтр працоўнай школы. Адказнасьць гэта ўскладаецца на бацькоў і іншых асоб, якія маюць дзяцей на сваім утрыманьні, а таксама на загадчыкаў устаноў, у якіх знаходзяцца дзеці.

Меру адміністрацыйнага ўплыву ўстанаўліваецца штраф ня больш 100 р. або прымусовых работы на тэрмін да 1-го месяцу.

Гэтыя меры ў залежнасьці ад месца ўчыненьня парушэньня іх накладаюцца прэзыдыумам гарсавету, або райвыканкомам, і прадугледжаны законам ад 10 ліпеня 1925 году аб адміністрацыйным пакараньні за парушэньне абавязковых пастаноў.

Звальненьне ад адказнасьці за непасылку дзяцей у першы канцэнтр працоўнай школы павінна вырашацца ў кожным асобным выпадку прэзыдыумам гарсавету, або прэзыдыумам райвыканкому ў адпаведнасьці з акалічнасьцямі справы з патрабаваньнем заключэньня інспектара Нарасьветы.

Этнаграфічная бібліяграфія Беларусі

Выйшла з друку выданьнем Інбелкульту этнаграфічная бібліяграфія Беларусі, гэта першая праца, якая падае вычэрпваючы матар'ял аб этнаграфіі Беларусі.

Калекцыя срэбра 17-19 стагодзьдзя

Ёўгадзел Беларускага музею напоўніўся калекцыяй срэбра 17-19 стагодзьдзяў якая важыць каля 6 пудоў і паступіла ў музей з аружэйнае палаты ў Маскве.

Па навуковай і музэйнай вартасьці гэта калекцыя займае першараднае значэньне.

У пачатку лютага яна будзе выстаўлена для агляду грамадзянства.

Новыя працы па этнаграфіі Беларусі

Здадзены ў друк запіскі катэдры этнаграфіі пад рэдакцыяй тав. Ластоўскага. У запісках будуць вымешчаны наступныя досьледы: праф. Прывалава—Музычныя інструманты Беларусі, праф. Баршчэўскага Фалёктанізм, Нікіфароўскага — Напоўпрыпеўкі — паўпрыслоўкі, Ластоўскага Прочкі і разлучным і інш.

МЕНСК

Менскія рынкі--крыніцы заразы

Нядаўна прэзыдыумам Менскага гарсавету была вынесена пастанова аб аздараўленьні менскіх рынкаў.

У сувязі з гэтым адбылася спэцыяльная нарада санітарных і тэхнічных працаўнікоў, на якой быў заслуханы даклад доктара Шушкевіча аб становішчы гэтых рынкаў. Апошнія знаходзяцца ў такім становішчы, што неабходна прыняць тэрмінова новыя меры для іх аздараўленьня. У асабліва дрэнных умовах знаходзіцца Каломенскі рынак.

З прычыны немагчымасьці пашырэньня плошчы Каломенскага рынку на займаемым ім месцы, нарада выказалася за пераноску яго ў напрамак па Чэрвенскім тракце, у раён бойні—на вучастку паміж Чэрвенскім трактам, Аранскай і Аранжарэйнай вуліцамі і Заходняй чыг.

Новы рынак неабходна абсталяваць водаправодам, скрынкамі для сьмецьця і г. д. Пасьля пераводу рынку плошча, занятая ім у сучасны момант, з усімі будынкамі, павінна быць выкарыстана часткова для пабудовы шматкватэрнага дому і часткова пад пасадку дрэў і расьлін. У першым паверсе дому змогуць зьмясьціцца магазыны МЦРК. Пры пераносы Каломенскага рынку ў раён бойні па гэтым рынку неабходна згуртаваць і гандаль жывёлай.

Для аздараўленьня Нямігскага рынку трэба ліквідаваць круг і крамы, якія размешчаны на плошчы. Мясныя і рыбныя рады павінны быць пакінуты на месцы, але ўпарадкаваны (водаправод, каналізацыя, пабудова жалезных ці каменных радоў, замест старой дрывяной страхі, і г. д.).

Нарада прызнала неабходным, каб дробныя крамы, якія знаходзяцца ў кругу, а таксама і таўкучка на працілеглым беразе Сьвіслачы былі перанесены на пляц Парыскай Камуны, дзе ўздоўж Шырокай вул. павінны быць паладжаны жалезныя і жалеза-бэтонныя рады па ўзоры маскоўскіх і ленінградзкіх рынкаў.

Усе гэтыя прапановы перадаюцца на зацьвярджэньне гарсавету.

СПОРТ

Спаборніцтвы на канькох

Сёньня, а 12 гадзіне дня, у садзе „Прафінтэрн" пачнуцца спаборніцтвы на канькох. У спаборніцтвах прыме ўдзел 20 чал. Адлегласьць прабегаў на канькох устаноўлена для мужчын 500 і 1500 мэтраў, для жачын 500 і 1500 мэтраў. На бегавых канькох для мужчын 500, 1500 і 5000 мэтраў.

Агульна-гарадзкая канфэрэнцыя фізкультурнікаў

18 студзеня адбылася агульна-гарадзкая канфэрэнцыя фізкультурнікаў, на якой прысутнічала 70 дэлегатаў. На гэтай канфэрэнцыі былі разданы дыплёмы ўдзельнікам спаборніцтваў, якія ўзялі першыя і другія месцы па лыжах, барацьбе і гірах.

З-ці дзень спаборніцтваў.

17 студзеня адбылася барацьба і штуршок дзьвюма рукамі на гірах.

Па штурханьні дзьвюма рукамі першыя месцы ўзялі т.т. Савіч (вага пяра) з вынікам 90,2 кілё, Равічбах (лягч. вага)—94,1 кілё, Зубіцкі (лёг. вага)—94,1 кілё, Кузьмін (паўпяжная вага)—98,5 кілё і Сьвечнікаў (сярэд. вага)—102,5 кілё.

Па барацьбе ідуны у вазе пяра Новікаў у 4 хв. 2 сек. атрымаў перамогу над Соскіным.

У лягчэйшай вазе Вайніловіч і Карольковіч правялі барацьбу ў нічыю.

У лёгкай вазе Мецік перамог Графтана ў 5 хв. 10 сек. і Анцінаў перамог у 19 хв. 20 сек. Меціка.

У сярэдняй вазе барысавец Страдзе перамог у 7 хв. 8 сек. Крупскага, Страдзе і Прыдачын (ваенв.) у нічыю.

Катовіч перамог Яноўскага ў тэрмін 3 хв. 37 сек. (паўпяж. вага) і Катовіч перамог Кідалінскага ў 5 хв. 15,5 сек.

Рабочае крэдытаваньне

Наркамат Грашовых Спраў БССР дазволіў выдаць на другі квартал студзень—сакавік 1928 г. на рабочае крэдытаваньне па ўсіх цэрабкопах каля мільёну рублёў. З гэтай сумы Менскі Цэрабкоп атрымаў 240.000 руб., Гомельскі—190.000 р., Віцебскі—215.000 руб., Бабруйскі—135.000 р. і г. д.

Гэты крэдыт складае 8 проц. з агульнага звароту цэрабкопу.

Пры выдачы доўгатэрміновага крэдытаваньня бярэцца 20 проц. налічнымі. Усе цэрабкопы аднавілі крэдытаваньне пайшчыкаў. 30 проц. усёй адпушчанай сумы выдзелена на дробна-крамны крэдыт.

Каапэрацыйныя навіны

— 17-га студзеня прыбыло 14 вагонаў пшанічнай мукі. Мука адпускаецца пайшчыкам па 4 кілёграмы на кніжку.

— 18-га студзеня прыбыў 1 вагон сьвежай рыбы з Азова.

— 18-га студзеня атрымана 80 скрынь галёш у колькасьці 4.000 пар. Галёшы адпускаюцца на кніжках.

—Гэтымі днямі прыбудзе вагон сьметанковага масла з Уфы. У канцы месяца чакаецца 1 вагон экспартнага і 1 вагон сьметанковага масла, а таксама прыбыў 1 вагон манкай крупы.

Выдача талёнаў на мануфактуру

Праўленьне МЦРК прыступіла да выдачы талёнаў на мануфактуру, з разьліку 1 талён на 80 пайшчыкаў, пры чым уведзены талёны новага ўзору, каб ня было падробкі.

Цэны на масла зьніжаны

Праўленьне МЦРК распачало продажу масла па цане замест 3 р.—2 р. 90 кап.

●●● КІНО ●●●

Кіно і дзеці

Усе канстатуюць, што кіно карціны сучаснага рэпэртуару наскрозь прасякнуты крымінальшчынай і эратычнымі тэндэнцыямі, якія атраўляюць нашу дзіцячую масу. Зусім адсутнічае педагагічная, поўна-каштоўная карціна.

Па якіх шляхох павінна ісьці перабудова кіно з дэмаралізуючага дзіцячую псыхіку фактара ў каштоўны педагагічны спосаб?

Такіх шляхоў два: 1) магчымая нейтралізацыя шкоднага ўплыву кіно пры тым рэпэртуары, які мы маем у сучасны час;

2) напружаная ярада над пабудовай новага дзіцячага фільму і распрацоўка мэтадаў яго скарыстаньня і паказаньня дзецям.

Першай і самай простай мерай барацьбы з дэмаралізуючым уплывам кіно зьяўляецца—забарона доступу дзецям на пэўна шкодныя для іх фільмы.

Спадзяваецца, што гэты спосаб прынясе значную колькасьць добрых вынікаў ні ў якім разе нельга, дзякуючы таму, што ўсякая забарона і абмяжаваньне не заўсёды змогуць дасягнуць мэты і часта законным і незаконным шляхам усё гэта ў значнай ступені добра абыходзіцца.

Аднак, адмовіцца ад гэтага спосабу ўсё-ж такі нельга.

У песнай сувязі з забаронай для дзяцей тых ці іншых фільм паўстае пытаньне аб спэцыяльнай педагагічнай цэнзуры.

У выніку гэтага магчыма будзе ўвесьці у пашпарце карціны абавязковую адзнаку, як-та—„дапушчана", або „ухвалена для дзяцей". Кіно-установы павінны будуць зьмяшчаць гэтыя адзнакі у афішах, абвестках і, наогул, кіно-рэкламах.

Каб адвярнуць дзяцей ад наведваньня шкодных карцін і прывабіць да больш палыходзячых зможа садзейнічаць арганізацыя калектыўнага наведваньня дзецьмі кіно.

Асабліва важным спосабам у барацьбе з адмоўным уплывам кіно дарослых зьяўляецца арганізацыя спэцыяльных кіно-сэансаў для дзяцей. Гэты тып кіно-сэансаў практыкуецца ўжо даўно, але ледзька яшчэ ня ўсімі кіно-тэатрамі.

На такім спэцыяльна дзіцячым сэансе ёсьць магчымасьць прыстасаваць усё абсталяваньне для дзяцей: тлумачэньне надпісаў, альбо вуснае тлумачэньне, гульні ў файе, што ў значнай ступені ўзмацняе выхавачае значэньне кіно.

Усё гаворанае датычыць, галоўным чынам, абароны дзяцей ад магчымай шкоды кіно.

Непараўнана важней, і больш складней, другі бок справы, а імена: пабудова савецкага педагагічнага фільму.

Тут перад намі паўстае шэраг вельмі цяжкіх задач. Прадпасылкай для вырашэньня новага фільму, адказваючай патрэбам і запытаньням сучаснай дзеткі, зьяўляецца пэўнае вывучэньне дзіцяці, як гледача.

Як успрымаюць дзеці розныя ўзросту той ці іншы зьмест карціны, прадпасылкі сэансаў, характар сюжету і фабулы, якой павінна быць схема разгортваньня гэтай фабулы і надворнае яе афармленьне, якім павінен быць абём кіно-матар'ялу, які дацца дзецям, які парадак і арганізацыя сэансаў, працягласьць антрактаў (зьмена цемры і сьвятла) і г. д., і г. д. Усе гэтыя пытаньні змогуць знайсьці сваё правільнае вырашэньне толькі на падставе дадзеных эксперыментаў.

У адносінах кіно-дыдактыкі і кіно-методыкі мы маем яшчэ зусім не распрацаванае поле, якое павінны распрацаваць нашы савецкія педалёгі, педагогі і педалёгі-урачы.

Такім чынам, лёгка патрабаваць стварэньне дзіцячага фільму, чымсі распраўлы яго пабудаваць. Гэтае пытаньне зьяўляецца цяжкай працай і патрабуе значных матар'яльных выдаткаў. З гэтага, аднак, ня выходзіць, што ўжо зараз нельга пачаць будаваць дзіцячы кіно-фільм. За гэтую працу ўжо ўзяліся і, мабыць, у хуткім часе мы ўбачым першыя яго вынікі.

С. М. РЫВЕС.

Вандроўны тэатр у Мазыры

Двухтыднёвае прабываньне беларускага вандроўнага тэатру ў Мазыры закончылася дакладам аб беларускім тэатры і дыспутам аб вандроўным тэатры Галубка.

Той факт, што памяшканьне, дзе адбываўся дыспут, было пераапоўнена, сьведчыць аб зацікаўленасьці да тэатру, узросьце нашага глядача.

Пільна аўдыторыя слухала цікавы даклад т. Галубка.

Выступаючыя адзначалі важную ролю вандроўнага тэатру ў выхаваньні мас і жадалі яшчэ большага набліжэньня працы тэатру да мас.

Учарашні глядач, а сёньня актыўны ўдзельнік дыспуту, закрануў і хворыя бакі вандроўнага тэатру. Побач з неараўнаным ростам, побач з адыходам ад такіх пастановак, як „Цені", яшчэ наглядаецца недахоп пастановак, асьвятляючых барацьбу рабочых і сялян Беларусі за сваё вызваленьне і галоўную работу па сацыялістычным будаўніцтву.

Шчыра разьвіталася трупа з мазырамі і назаўтра пакінула абслугоўваць гаухія вёскі і заводы Мазыршчыны.

Янка Ліпнёвы.

Касавая рэформа ў Менску

Ад 1-га лютага ў Менску будуць ліквідаваны Цэнтральная каса пры НКФ і прыбыткова-выдатковая каса пры Менскім Аирфа.

Замест гэтых кас пры Ўсебеларускай канторы Дзяржбанку ад 1-га лютага будзе арганізавана аб'яднаная касавая часьць НКФ, якой будуць перададзены усе казначэйскія апэрацыі, якія цяпер выконваюцца вышэйпамянёнымі касамі.

Казначэйская часьць будзе зьмяшчацца ў першым паверсе дому Дзяржбанку ўваход з рогу Савецкай і Камсамольскай (памяшканьне гэта раней займала галоўная працоўная каса ашчадкасьці).

Цэнтральная каса ў гэта памяшканьне пяройдзе ад 23 студзеня.

Паведамленьні

— Ад пятніцы, 20 студзеня пачынаюцца заняткі ў вячэрніх партшколах Кастрычніцкага раёну.

Адказны рэдактар Як. ПСЬМЛЎ

СУД

Ашуканства селяніна.

Селянін Хвінчук атрымаў за прывезеную ў горад бульбу 20 руб. Хвінчук хацеў на атрыманыя грошы набыць якую-небудзь вопратку і пайшоў на рынак. Па дарозе да яго падышоў малады чалавек, які сябе назваў рабфакаўцам і пачаў распытваць Хвінчука аб прычынах яго прыезду ў горад. Даведаўшыся, што Хвінчук выручыў 20 руб. за бульбу, „рабфаковец" ад яго пашоў. Праз некалькі хвілін да Хвінчука падышоў чалавек, які папрасіў яго зайсьці ў вароты. Там ён выняў срэбны гадзіньнік і прапанаваў Хвінчуку купіць. Далей да іх падышоў яшчэ адзін чалавек, які назваўся майстрам гадзіньнікаў і прыняў удзел у куплі гадзіньніка, прапанаваў за гадзіньнік 30 р. Але гандляр адмовіўся, кажучы, што ён ня хоча, каб такі добры гадзіньнік застаўся ў майстра, і прапанаваў забраць яго Хвінчуку за 20 руб. Хвінчук заплаціў 20 руб. і не пасьпеў ён атрымаць гадзіньнік, як уся кампанія прадаўцоў разьбеглася. Разьлядзеўшы гадзіньнік, Хвінчук пераканаўся, што ён ня срэбны і што кошт яго ня больш 3-4 руб.

Крымінальны шыпук, пуды зьвярнуўся Хвінчук, высьвятліў, што гэта праца ашуканцаў Ліхачова і Шпрэйрэгена.

Нарэшце, дзе разглядалася гэта справа, прыгаварыў Ліхачова і Шпрэйрэгена да 6-ці месяцаў зьвяўленьня, але, прыстасаваўшы амністыю, ад кары звольніў.

Адначасова суд прысудзіў выплаціць Хвінчуку розьніцу ў кошце гадзіньніка ў суме 15-ці рублёў.

Як працуе Асоавіяхім Беларусі

Асоавіяхім у апошні час разгарнуў у Беларусі шырокую працу. За час свайго існаваньня ён пералаў дзяржаве 4 аэрадромы. Чырвонай арміі перадаў ены 4 самалёты, а ў фонд абароны СССР—40.000 руб.

Штогодна трацілася каля 500 р. на выдаткі па ўкамплектаваньні вайскова-паветраных школ.

Па Беларусі налічваецца 2.249 ячэек Асоавіяхіму, якія аб'ядноўваюць 114.074 чал.

Асаблівае значэньне ў росьце арганізацыі Асоавіяхіму меў «Тыдзень абароны». Дзякуючы аб'яднаньню вакол гэтай кампаніі ўсіх лепшых сіл партыйных, савецкіх, прафэсыянальных і грамадзкіх арганізацый, яна прайшла арганізавана.

«Тыдзень абароны» даў у фонд «Наш адказ Чэмбарлену», па лініі Асоавіяхіму і прафсаюзаў, каля 50.000 руб. У Асоавіяхім уступіла новых членаў 16.459 арганізавана новых ячэек 115, гурткоў—195 і пабудавана стралковых ціраў—59.

Асоавіяхім мае 728 вайсковых гурткоў, 10 спартыўных, дзе галубіная станцыі, 143 стралковыя ціры, 150 асоавіяхімаўскіх куткоў, 20 вайсковых бібліятэк, дзьве мадольныя майстэрні, тры пастаянныя выстаўкі і некалькі агітпавозак. Усяго па гэтай лініі ўцягнута ў працу да 10.000 чал.

Праца па валянізацыі працоўных ставіцца на правільныя рэйкі і пачынае паглыбляцца.

Па паветрана-хэмічнай абароне толькі па 6-ці округах знаходзіцца пад ведамам Асоавіяхіму 38 хэм-гурткоў, 26 авіяхэмкаманд і атрадаў і адна камэра акурваньня.

У работу па паветрана-хэмічнай абароне ў гэтых округах уцягнута 2.058 членаў таварыства. Інтарэс да гэтай працы маецца асабліва з боку сялянства.

Паміма валянізацыі ў вёсцы вядзецца праца ў гурткох першай дапамогі. Гурткі арганізуюцца пры медычных і фельчарскіх пунктах. Гэтымі гурткамі кіруюць настаўнікі, дактары і фэльчары. Гурткі гэтыя жыцьцёвыя, цікавы для сялянак і працуюць добра.

У вёсцы вядзецца таксама праца па заклады паказальных вучасткаў з хэмічнымі ўгнаеньнямі і па барацьбе са шкоднікамі садоў, кватэр і сьвірнаў. З вясны мінулага году было закладзена 87 вучасткаў. Вучасткі гэтыя ў вёсцы пачынаюць прышчапляцца, іх паказальнасьць сябе апраўдвае. Цэнтральны савет Асоавіяхіму на гэту справу адпусьціў округам 2.500 р.

С.-г. секцыя распрацавала плян працы і на гэты год. Неабходна прыцягнуць да гэтай працы актыў і вясьмельных работнікаў.

У апошні час ажывілі працу і акруговыя саветы Асоавіяхіму, якія ўцягваюць у гэту працу актыў, утвараюць інструктарскія групы з лепшых сакратароў ячэек, арганізуюць курсы па перападгатоўцы і г. д.

Такая ў кароткіх рысах праца Асоавіяхіму Беларусі на апошні час.

М. К—н.

Ад рэдакцыі: Паводле допісаў з вёсц, якія ёсьць у рэдакцыі, відаць, што кіраўніцтва акруговых саветаў нізавымі ячэйкамі яшчэ невыстарчальнае, і ў апошніх работа моцна кульгае.

Рацыяналізацыя апарату аховы здароўя

Вынікі нарады акрінспэктур аховы здароўя БССР

Побач з пытаньнямі па пяцігодцы Наркам. Аховы Здароўя па мэдабслугоўваньні застрахаваных, на нарадзе стаялі пытаньні рацыяналізацыі апаратаў органаў аховы здароўя і падводзіліся вынікі працы ў гэтай галіне.

Пры рэарганізацыі апаратаў акрздраву і Наркам. Аховы Здароўя і пры адпаведным іх скарачэньні, ня былі захаваны ўсе неабходныя прадпасылкі—як узмацненьне нізавых ячэек, павялічэньне аб'ёму іх праў, ня было ні ў якай меры забясьпечана правільнае і неабходнае кіраўніцтва справай аховы здароўя на раёнах.

Бязумоўна, ёсьць дасягненьні па лініі рэарганізацыі апарату самага Наркам. Аховы Здароўя. Мы замянілі сыстэму аддзелаў, пададдзелаў—функцыянальнай сыстэмай інспэктароў, пры якой кожны інспэктар ведае сваю частку і адказвае за яе, а таксама непасрэдна атрымлівае ўказаньні ад Наркому. Гэта спрасьціла мэханізм перадачы кіраўніцтва на пэрыфэрыю і павялічыла адказнасьць кожнага работніка. Апарат Наркам. Аховы Здароўя скарочан ад 38 да 22 адзінак. Адна частка працы—санітарная статыстыка разам з адпаведным штатам, ляжаўшая раней цалком на Наркам. Аховы Здароўя і акрздраве—перадана ЦСУ і акрстатбюро. Тут яшчэ пытаньне канчаткова ня вырашана, наколькі гэта было зроблена правільна.

Прыдзецца ўважліва яшчэ вывучыць пытаньне, якія функцыі статыстыкі можна будзе перадаць цалком ЦСУ і як я павінны быць пакінуты з статыстыкі за Наркам. Аховы Здароўя і яго органамі на мясцох. Пры рэарганізацыі апарату НКАЗ, ня гледзячы на яго скарачэньне, кіраўніцтва ня толькі не пагоршылася, але палепшылася.

Па лініі апаратаў акрздраваў праведзена мэханічнае скарачэньне іх тэхнічнай часткі, але мала яшчэ рацыяналізавана іх работа. Вось галоўныя прычыны, якія перашкаджаюць акрінспэктуры перайсьці на новыя мэтады працы. Ня ўсюды прадастаўлена самастойнасьць нізавым ячэйкам, функцыянальным адзінкам мэдыка-санітарнай арганізацыі ў сэнсе децэнтралізацыі бюджэту, павялічэньня аб'ёму праў кіраўнікоў гэтых устаноў і ў іншых галінах, як найму і падбору патрэбных для даных устаноў работнікаў. Атсутнічае спэцыяльна кампэтэнтны кіраўнік справай аховы здароўя ў раёне, які мог-бы таксама выканаць функцыі і санітарнага працаўніка, вельмі патрэбнага для вёскі. Гэтыя абставіны, натуральна, перашкаджаюць з належнай цьвёрдасьцю і рашучасьцю праводзіць неабходныя мэдыцынскія мерапрыемствы па ўсёй акрузе і, тым больш, у плянавым парадку.

У мэтах паляпшэньня кіраўніцтва акрінспэктур месцамі і больш сталай сувязі з кіраўнікамі ўстаноў, Наркам, Аховы Здароўя прапанавана мець пры інспэктурах, як сталаму органу, пэрыядычна склікаемаму навукова-кансультацыйную нараду з кіраўнікоў буйнейшых устаноў і дактароў-спэцыялістых, яны павінны прапрацоўваць асноўныя арганізацыйныя і спэцыяльныя мэдыка-санітарныя пытаньні.

Акрамя таго Наркам Аховы Здароўя прапанаў акрінспэктарам плянава і рэгулярна склікаць канфэрэнцыі з кіраўнікоў мэдыка-санітарных устаноў гораду і вёскі.

Хроніка сялянскай пазыкі

— Наркамфін Беларусі атрымлівае шмат лістоў ад сялян з запытаньнямі аб умовах пазыкі, калі будуць высланы аблігацыі і г. д. Лісты паказваюць, што інтарэс беларускага сялянства да пазыкі паступова ўзрастае.

— Згодна тлумачэньня Наркамфіну ад 1-га ліпеня 1929 г. аблігацыямі пазыкі можна плаціць сялянскім падатак і ўносіць сялянкам на абавязковым акладным страхаваньні. Апрача таго аблігацыі прыймаюцца ў заклад па дагаворах, на арандзе зямельных і лясных участкаў, прамысловых прадпрыемствах.

— Кожны раён атрымае на свае мясцовыя патрэбы 10 проц. тэй сумы, на якую будзе прадана пазыкі ў даным раёне. Усяго раёны Беларусі атрымаюць на свае мясцовыя патрэбы да 35.000 руб.

Арганізацыя т-ва фота-аматараў г. Менску

16-га студзеня адбыўся агульны сход фота-аматараў г. Менску. У залі кіно „Інтэрнацыянал" сабраліся амаль усе, хто цікавіцца фота-аматарствам. З дакладам аб будучай працы менскага фота-таварыства выступіў адзін з арганізатараў таварыства т. Салавейчык.

— Фота іграе вялікую ролю ў культурным жыцьці краіны. Гістарычныя моманты нашай гэрайчнай барацьбы, нашага будаўніцтва адбіваюцца фота-аматарамі і могуць стаць уласнасьцю ўсіх працоўных. Фота-аматарства павінна ўкараніцца ў рабочыя масы. Мэта нашага таварыства абліччыць членам таварыства атрымальне неабходных для работы матар'яў, і навучаньне маскаваму фотаграфаваньню. Мы павінны валодзіць сувязь з фота-гурткамі Беларусі шляхам арганізацыі конкурсаў і выставак, якія выявяць дасягненьні фота-мастацтва Беларусі. Нашым папярэднім запісам мы ўжо ахапілі фота-аматараў амаль што ва ўсіх прафэсыянальных саюзах. Зацікаўленасьць фота-аматарствам з боку працоўных вялізарная. Пры ўсіх клюбах арганізуюцца фота-гурткі.

Далей тав. Салавейчык прачытаў статут таварыства, зацьверджаны Акрвыканкомам. Выбрана праўленьне таварыства і рэвізійная камісія.

Таварыства ў бліжэйшы час прыступае да працы па абхопе ўсіх фота-аматараў у БССР і па падрыхтоўцы сваіх экспанатаў для краязнаўчай выстаўкі, якая арганізуецца Інбелкультам у дзяржаўным музэі.

ТЭАТР. КІНО

Другі Дзяржаўны Беларускі тэатр

НЯДЗЕЛЯ, 22 СТУДЗЕНЯ
ВЕЧАР БЕЛАРУСКАЕ КАМЭДЫІ.
„Пінская Шляхта", камэдыя-у адным дзеі. 1865 г.
„Модны Шляхцюк", бытавая-камэдыя ў адным дзеі,
„Чорт і Баба", камэдыя ў адным дзеі.
Пачатак а 8 з палов. гадзіне.

Кіно-тэатр „Культура" Грандыёзны мастацкі фільм „ТАКАЯ ЖЕНЩИНА" (Чужая)
Зьвыш праграмы ХРОНІКА СОВКІНО 51-109.

Кіно „Інтэрнацыянал". КОРЫНА БЕЛЬ у выд. фільме „Пылкая юность" у 7-мі част.
Зьвыш праграм. гастр. артыста Мак. і Ленінгр. эстрады Е. А. ШУРАТАВА, сатыра, юмар, апошнія навіны.

Кіно „Чырвоная Зорка". Мастацкі фільм „НЕМОЙ ДРУГ" драма у 6 частках
Пачатак сэансаў а 6, 7 з палов., 9 і 10 з палов. г. увеч.
Наступная праграма: „БАРЬЕТЭ".

Кіно „Пралетары". „Вторая жена" *Пачатак сэансаў а 6, 7½, 9 і 10½ г. увеч. Касы а 6 гадз. увеч.*
Чарговая пастановка: „СУМКА ДИПКУРЬЕРА"

IV тираж выигрышей госуд. выигрышного займа 1927 г.
будет производиться 20-22 января 1928 года в Сормове (Н.-Новгороде).
В этом тираже будет разыграно 4.001 выигрыш на сумму 700.000 р. в том числе:

1 выигрыш	—	в 50.000 руб.
2 выигрыша	—	по 25.000 руб.
5 выигрышей	—	по 10.000 руб.
10 выигрышей	—	по 5.000 руб.
71 выигрыш	—	по 1.000 руб.
252 выигрыша	—	по 250 руб.
3.660 выигрышей	—	по 100 руб.

Выплата выигрышей будет производиться обычным для всех тираней этого займа порядком.
Народный Комиссар Финансов БССР МИКУЛИН.
Заведующий Валютным Отделом АБРАМСОН.

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты адбываецца да 2-ое гадзіны дня.

Адкрыта падпіска на старэйшую ў Беларусі (дванаццаты год выданьня) камуністычную газэту
На люты месяц — На люты месяц

ЗЬВЯЗДА
орган ЦК КП(б) Беларусі.

Умовы падпіскі:
На 1 год—9 р. 75 к. | На 3 мес.—2 р. 60 к.
„ 6 мес.—5 р. | „ 1 мес.—90 кап.

Падпісна прымаецца:
У Менску: Галоўнай Канторай газэты «Зьвязда»—Савецкая, 63, 3-ці паверх,—штодзённа ад 9—3 гадз., уноўнаважанымі Галоўнай Канторы і разносчыкамі газэты.
У Віцебску: аддзяленьнем выдавецтву „Известия" і „Правда", Ленінская, 11.
У Гомелі: аддзяленьнем выдавецтву „Известия" і „Правда" (Савецкая, № 17).
У Магілеве: Канторай газэты „Магілеўскі Селянін" (Ленінская, 35).
У правінцыі: аддзяленьнямі Белдзяржвыдавецтва, уноўнаважанымі Галоўнай Канторы і ўсіх пошта-тэлеграфнымі канторамі.

ЗАОЧНЫЕ ПРОМЫШЛЕННО-ЭКОНОМИЧЕСКИЕ КУРСЫ „ПОЛИГЛОТ"
(Основ. в 1917 г.)
состоящие в ведении С.-К. Крайоно.
ПРЕДМЕТЫ ПРЕПОДАВАНИЯ:
бухгалтерия, коммерческ. вычисл., торг. корреспонд., делопроизводство, исправление почерка, техн.-худож. черчение, машиностроительное черчение, рисование, стенография и конструкт (дефинитиф).
Занятия посредством переписки по почте специально составленными лекциями, ВПОЛНЕ ЗАМЕНЯЮЩИМИ УСТНОЕ ПРЕПОДАВАНИЕ. По окончании курса учащиеся подвергаются испытанию в специальн. квалифик. комиссии и получают соответствующее СВИДЕТЕЛЬСТВО.
На 1-е ноября 1927 г. на курсах состоит свыше 15.000 учащихся.
Плата посильная от 1 до 3 рублей.
Требуйте бесплатно проспекты, программы и условия.
Адрес: Ростов на Дону „ПОЛИГЛОТ".

Згубленыя і ўкрадзеныя

наступныя дакументы лічыць несапраўднымі:

Асабовая кн. Ляшкевіча К., выд. Плешчаніцкім РВК. 426
Конская картка Завоба Е. 427
Вучотна-конская картка Грынеціча І. Д. выд. Гайдаслаўскім ВВК. 428
Асабовае пасьведчаньне Сьвірскай А., выд. Заслаўскім культадзелам. 429
Віза Яселя К., выд. Заслаўскім РВК. 430
Дапрызыўная кн. Яселя К., выд. Заслаўскім РВК. 431
Асабовае пасьведчаньне Міцянова А. П., выд. Самарскім прытулкам. 1353
Справка аб працы Міцянова А. П. 1354
Камсамольскі білет Янава І. Ф., выд. Менкаругомам ЛКСМ за № 72.410. 1355
Квапэрац. кн. Лагунчыка П. В., выд. МЦРК. 1356
Квапэрац. кн. Лагунчыка П. В., выд. МЦРК. 1357
Бесправоўная кн. Мурыч Т. Б., выд. Менстрахкасай. 1358
Лікавая кн. Александроўскай В. В., выд. Менстрахкасай. 1359

Кошт публікацыі аб згубе аднаго дакумента **50 кап.**

Похищены документы на имя Бейлин Эсфирь Моисеевны: жел.-дор. удостоверение личности и служебный разовый билет № 3.465.334, выд. Правл. Зап. ж. д., матрикул Ленинградского университета. Считать недействительными. Просьба документы возвратить по адресу: ул. К. Маркса, 34, кв. 4, Бейлиной.

ПА СПРАВАХ падпіскі і абвестак звяртацца па тэлефону 7-81.

Друкарня газэты «Зьвязда» — Менск.